

САРТАВАЦЬ СМЕЦЦЕ МОЖНА ТВОРЧА 5

ЦІ ЗАПАТРАБАВАНАЯ «ЮВЕЛІРКА» Ў НАШЫ ДНІ? 11




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

6 КАСТРЫЧНІКА 2020 г. АЎТОРАК № 194 (29308)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ПАЦЭЕЎ, начальнік галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя:**

*«Апошнім часам мы бачым, што рост захваральнасці на COVID-19 працягваецца. І ўжо зараз можна казаць, што гэта другая хваля. Мы назіраем аналагічную карціну ў іншых краінах Еўропы і свету. Гэта звязана з нармальным цячэннем захваральнасці, з характарыстыкамі віруса. У нас адпрацавана ўся сістэма, усе алгарытмы аказання меддапамогі, усе клінічныя пратаколы. Мы стварылі сістэму, якая паказала сваю эфектыўнасць. У нас ёсць выразныя падзелы патокаў пацыентаў па цяжкасці захворвання. Ложкавага фонду дастаткова. Дастатковыя магутнасці анестэзіёлага-рэанімацыйнай службы, ШВЛ. За апошнія некалькі месяцаў значна палепшылася сітуацыя па забеспячэнні кіслароднымі пунктамі. Сістэма аховы здароўя ў цэлым гатова да працы. Прафесіяналы ведаюць пратаколы, у іх ёсць вопыт работы. Акрамя таго, сістэма аховы здароўя забяспечана лекамі для аказання меддапамогі. Для супрацоўнікаў дастаткова сродкаў індывідуальнай аховы».*

# На сваім кардоне



39-гадовы жыхар вёскі Кардон Шумілінскага раёна Аляксандр ЛІТОЎКА ў вольны час займаецца ўпарадкаваннем свайго падворка. Ён працуе качагарам у Мікалаеўскай бальніцы сацыяльнага догляду, але дома вясковец шчыруе з дрэвам — цяслярыць і сталярнічае. Перавёз з суседняй вёскі дзедаў дом, абшаляваў, зрабіў прыбудову. Надаў гаспадарчым будынкам сучасны выгляд, А восць гэтае дрэва ён прыстасаваў пад «клумбу» — на ім будуць стаяць гаршкі і вазоны з кветкамі — так замовіла яму жонка. Побач на іншым дрэве месціцца домік — падарунак, які некалькі гадоў таму Аляксандр зрабіў свайму сыну Дзянісу.

— Мне падабаецца жыць у вёсцы, будаваць, майстраваць, займацца дызайнам прысядзібнага ўчастка, — гаворыць дбайны гаспадар.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

Толькі ў «Звяздзе»

# «УСМІХАЮЦЦА КВЕТКІ ЛАБЕЛІІ...»

### НЕВЯДОМЫЯ РУКАПІСЫ ЧАТЫРОХ ВЕРШАЎ КАРАТКЕВІЧА

**Ужо хутка мы адзначым 90-годдзе класіка беларускай літаратуры Уладзіміра Караткевіча, які вельмі не любіў, калі яго называлі рамантыкам. Але створаны ім сапраўды рамантычны вобраз Беларусі — гераічнай, шляхецкай, старасвецкай, інсургенцкай — прыцягнуў да беларушчыны не адно пакаленне літаратараў. І прыцягвае дагэтуль — летась самай прадаванай кнігай Беларусі сталі «Каласы пад сярпом тваім». Спадчына Уладзіміра Караткевіча, як спадчына кожнага геніяльнага творцы, — невычэрпная крыніца для вывучэння. Бо ўвесь час адкрываюцца новыя факты, знаходзяцца новыя матэрыялы. Тут маюць каштоўнасць любыя артэфакты: скрэмзаная паперка ці дароўны надпіс на кнізе, службовая заява ці хай сабе рахунак з крамы, які чамусьці захоўваў класік. Ну а самае жаданае для навукоўцаў — вядома, знайсці рукапісы. Нават калі гэта вядомыя творы — арыгіналы, напісаныя рукой аўтара, могуць расказаць вельмі шмат і прынесці сапраўдныя адкрыцці.**

Аднойчы невядомыя раней рукапісы чатырох вершаў Уладзіміра Караткевіча трапілі да галоўнага рэдактара выдавецтва «Мастацкая літаратура» паэта Віктара Шніпа. Вось што распавядае пра гэта Віктар Анатолевіч:

— Вясной 2010 года, калі ў «Мастацкай літаратуры» рыхтавалася да друку кніжка пра кампазітара Яўгена Глебава, яго жонка Ларыса Васілеўна, седзячы ў мяне ў кабінеце, раптам сказала: «Я хачу зрабіць вам невялікі падарунак. У мяне ёсць чатыры вершы Уладзіміра Караткевіча, якія ён падарыў мне ў 1964 годзе. Я раней думала іх аддаць аднаму паэту, але перадумала. Аддаю вам». Чым каштоўныя гэтыя рукапісы? У першую чаргу — гэта арыгіналы. І яшчэ тым, што ў «Рамансе Марылі», калі параўноўваць рукапіс і публікацыю верша ў зборы твораў, што выходзіць у 25 тамах, ёсць чатыры радкі, якія зусім невядомыя чытачам і, магчыма, даследчыкам творчасці Уладзіміра Караткевіча. Ды і ў астатніх рукапісных творах ёсць невялікія адрозненні ад кніжных.

СТАР. 13

Без бюракратыі

# Што відаць праз «адно акно»?

Атрыманне даведкі не павінна быць святам, якое пасля тыдзень адзначаюць усёй сям'ёй



**Павялічыць колькасць працэдур, якія могуць аказвацца па прынцыпе «адно акно», каб людзі не хадзілі па мноству кабінетаў, па мінімуме трацілі свой час і сродкі і атрымлівалі комплекс паслуг аднамомантна. Захаваць мінімальную колькасць дакументаў, якія неабходна прадстаўляць для кожнай працэдуры, выключыўшы з пераліку паперы, без якіх можна абысціся, звяртаючыся ў службу «адно акно». Арганізаваць пакетны прынцып аказання паслуг, каб людзі маглі па адной заяве атрымаць цэлы комплекс дакументаў. Зрабіць як мага больш працэдур электроннымі, каб паслугу можна было заказаць праз інтэрнэт. Такія планы стаяць перад службай «адно акно» краіны. Рэалізаваныя і задуманыя новаўвядзенні, а таксама спецыфіку работы спецыялістаў службы абмеркавалі на рэспубліканскім семінары «Найлепшыя практыкі ажыццяўлення адміністрацыйных працэдур і перспектывы далейшага развіцця» ў Лідзе.**

СТАР. 4

## КОРАТКА

- **БКК упершыню паставіла калій у Кітай па Паўночным марскім шляху.**
- Мабільная праграма для людзей з бессонніцай стала найлепшым стартапам на «Дні інвестара — 2020».
- **Добраахвотнікі, якія атрымалі вакцыну ад COVID-19, адчуваюць сябе добра.**
- Археалагічную калекцыю Язэпа Драздовіча ўпершыню прадставяць у Нацыянальным гістарычным музеі.
- **Колькасць інфіцыраваных каранавірусам жыхароў Зямлі можа скласці каля 10 %.**

ISSN 1990 - 763X
20194
9 771990 763008

З першых вуснаў

# «Мытня ў большай ступені, чым іншыя ведамствы, — люстэрка нашай эканомікі»

## Беларусь будзе імкнуцца самастойна аказваць лагістычныя паслугі сваім перавозчыкам

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка правёў рабочую сустрэчу са старшынёй Дзяржаўнага мытнага камітэта Юрыем СЯНЬКО.**

«Перадусім я хацеў бы пачуць аб выніках работы вашага ведамства ў разрэзе праз мытныя службы, каб ацаніць сітуацыю ў нашай эканоміцы. Вы разумееце, што мытня ў большай ступені, чым іншыя ведамствы, — люстэрка нашай эканомікі», — заўважыў беларускі лідар.

Ён папрасіў Юрыя Сянько ў дакладзе звярнуць увагу на «вузкія» месцы — як развіваемся ва ўмовах сусветнага крызісу, выкліканага пандэміяй, і што неабходна з пункту гледжання мытных службаў зрабіць для ўтрымання эканомікі ў гэтым годзе на леташнім узроўні.

«Другая тэма, пра якую вы мне павінны далажыць, — сітуацыя на беларуска-літоўскай і беларуска-латвійскай граніцы, а таксама на граніцы з Польшчай. А калі ёсць больш абагульненая інфармацыя, то і з Украінай. Асабліва, што датычыцца дзвюх балтыйскіх дзяржаў — Літвы і Латвіі, — сказаў Прэзідэнт. — ***Амаль 40 працэнтаў грузавікоў у гэтым годзе, якія вязуць грузы ў Беларусь, ідуць з Літвы і Латвіі.*** Я не бяру звычайных грамадзян, якія перамяшчаюцца, і гэтак далей. Гэта велізарны аб'ём».

Па словах Прэзідэнта, «калі мы возьмемся за гэты паток, то лагістычныя пункты Літвы недаатрымаюць дзесьці чвэрць». Зараз з Расіяй вядуцца размовы аб пераарыентацыі грузаў з балтыйскіх дзяржаў на порт ва Усць-Лузе Ленінградскай вобласці. Найперш гэта нафтапрадукты, калійныя ўгнаенні.

Таксама кіраўнік дзяржавы адзначыў, што шматлікія паслугі і для нашых суб'ектаў гаспадарання, і для прадпрымальнікаў ЕАЭС аказваюцца ў Літве. «Але наколькі я інфармаваны, у тым ліку і вамі, мы гэтыя паслугі можам аказаць перавозчыкам у Беларусі. Як вы бачыце рашэнне гэтай праблемы?» — звярнуўся Прэзідэнт да старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта.

Юрый Сянько пачаў даклад са статыстыкі знешняга гандлю, што склала за восем месяцаў бягучага года. «Мытную граніцу Рэспублікі Беларусь з краінамі Балтыі, Польшчы і Украіны за восем месяцаў перасек 71 мільён тон тавараў, што на 15 працэнтаў менш, чым у мінулым годзе. На гэту статыстыку паўплывала Расійская Федэрацыя, якая на 30 працэнтаў знізіла аб'ём нафтапрадуктаў, якія рэалізоўваліся для краін Заходняй Еўропы. Наша ж памяншэнне экспарту і імпарту адбылося толькі на дзесяць працэнтаў», — сказаў Юрый Сянько.

Зніжэнне аб'ёмаў адбілася ў асноўным на чыгуначным транспарце, нязначна — на аўтамабільных пунктах пропуску. Гэта адбылося з-за памяншэння пакупніцкіх магчымасцяў у Еўропе і краінах ЕАЭС. Але з чэрвеня патокі грузаў павялічваюцца.

Прэзідэнт задаў пытанне, ці не назіраецца спаду з-за новай хвалі каранавіруса. Юрый Сянько адказаў, што пакуль адзначаецца рост колькасці транспартных сродкаў, якія перасякаюць граніцу, але ў асноўным перавозяць тавары невялікага кошту.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### КАМЕНТАРЫЙ У ТЭМУ

Больш падрабязна пра дзейнасць мытнай службы журналістам Юрый Сянько расказаў пасля размовы з кіраўніком краіны.

Па яго словах, вялікая ўвага нададзена перамяшчэнню тавараў медыцынскага прызначэння. Іх праз нашу краіну перавезена каля мільёна тон. У асноўным гэта тавары для барацьбы з каранавірусам для Беларусі і партнёраў па ЕАЭС. Такія грузы афармляліся без чаргі.

«Таксама гаворка ішла пра тое, што сёння Рэспубліка Беларусь гатова многія работы і функцыі выконваць на тэрыторыі сваёй краіны. Такія работы і паслугі — так традыцыйна склалася — аказваліся для нашага бізнесу за мяжой, у той жа Літве, Польшчы. Сёння ў нашай краіне пабудаваны транспартна-лагістычныя цэнтры, якія могуць аказваць разнастайныя паслугі, звязаныя з захаваннем тавараў, драбненнем, маркіроўкай, сарціроўкай», — сказаў старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта.

Нягледзячы на змяншэнне колькасці грамадзян на мяжы, кантрабандысты не спяць. Як паведаміў Юрый Сянько, паўтара тыдня таму выявілі ўвоз з Літвы ў Расію праз Беларусь 3200 грамаў какаіну.

Ён прывёў лічбы па папаўненні казны плацяжамі ад Дзяржаўнага мытнага камітэта: на сёння ў бюджэт пералічана 6,1 мільярда беларускіх рублёў. На канец года гэтая сума павялічыцца да 8,5 мільярда.

Наконт пунктаў пропуску — у снежні заканчваецца будаўніцтва пункта «Урбаны» на латвійскім напрамку, а ў першым квартале 2021 года ўвядуць у дзеянне пункт пропуску «Верхні Церабяжоў» на ўкраінскім.

У Юрыя Сянько запыталі, ці існуюць больш жорсткія патрабаванні для грамадзян па перамяшчэнні тавараў?

«Мытныя службы выконваюць усе санітарныя нормы, якія патрабуюцца ва ўмовах пандэміі, — выключаюць перамяшчэнне тавараў, якія могуць паўплываць на бяспеку людзей. Перамяшчэнне праз мяжу тавараў абумоўлена выключна нарматыўна-прававымі актамі, якія даюць магчымасць перамяшчаць толькі тыя тавары, якія прызначаны для асабістага карыстання. Тавары для камерцыйных мэт падлягаюць аплаце мытных плацяжоў. Такія ўмовы больш жорсткія, яны ўведзены ва ўсіх краінах. Сёння ў краіны ЕС немагчыма ўвезці нават адзін бутэрброд», — дадаў старшыня камітэта.

Гэтыя патрабаванні датычацца ў першую чаргу прадуктаў харчавання.

У краіне павялічваецца эксплуатацыя электронных пломбаў, што спрашчае і робіць таннейшым мытнае суправаджэнне пэўных грузаў. «Калі выкарыстоўваць мытнае суправаджэнне, то толькі з Брэста да Оршы кошт такой перавозкі каля 300 долараў, электронная пломба каштуе сёння каля 50 долараў. Але гэта толькі ў тым выпадку, калі кіроўца перамяшчае груз, фінансавая гарантыя якога не пакрывае кошт тых плацяжоў, якія ён павінен быў бы заплаціць, калі б тавар выпускаўся ў свабоднае абарачэнне», — растлумачыў ён.

Наконт пытанняў у сувязі з пандэміяй: калі электронныя пломбы не выкарыстоўваліся, у суткі выяўлялі каля 30 адхіленняў кіроўцаў ад маршрутаў. З выкарыстаннем пломбаў такіх выпадкаў стала не больш за адзін.

# «Вы з'яўляецеся апорай стабільнасці нашай дзяржавы»

**З такімі словамі Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка звярнуўся да вясковых жыхароў нашай краіны. А сказаў ён гэта ў суботу падчас наведвання храма Іаана Прадцечы ў аграгарадку Шаршуны Мінскага раёна. Святыню перад візітам кіраўніка дзяржавы асвяціў мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веньямін, Патрыяршы Экзарх Усяе Беларусі.**



Фота БелТА.

«Перш за ўсё дазвольце павіншаваць вас з гэтым светлым днём, з гэтым добрым часам — у нашай краіне з'явілася яшчэ адно цёплае, утульнае месца, і я вельмі спадзяюся, што мы заўсёды будзем прыходзіць сюды, каб падумаць пра будучыню, згадаць усё добрае мінулае і зрабіць правільныя высновы наперад», — звярнуўся ў храме Аляксандр Лукашэнка да вернікаў.

Унікальны для нашай краіны храмавы комплекс у візантыйскім стылі, які ўключае ў сябе царкву, прычтавы дом, дзіцячую пляцоўку і месца для адпачынку вернікаў, пабудаваны за два гады на сродкі вядомага расійскага бізнесмена Міхаіла Гуцэрыева. Прэзідэнт выказаў яму падзяку за ўзятыя абавязацельствы па будаўніцтве не толькі гэтага храмавага комплексу, але і іншых сацыяльных ды вытворчых аб'ектаў па ўсёй краіне.

За апошнюю чвэрць стагоддзя ў Беларусі пабудавана больш за паўтары тысячы культавых будынкаў, і гэта работа працягваецца, адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Абсалютна ўпэўнены, што наша зямля, дзякуючы вось гэтай падзвіжніцкай дзейнасці, заўсёды будзе знаходзіцца пад аховай Госпада, — дадаў ён. — У гэтым канкрэтным месцы я яшчэ раз упэўніўся, якая цудоўная ў нас зямля. І мы павінны абавязкова яе захаваць».

Ён выказаў пажаданне, каб храмавы комплекс быў напоўнены людзьмі: «Калі праходзіце міма, проста завітайце, падумайце пра добрае».

Яшчэ адно пажаданне Прэзідэнта датычылася беларусаў, якія працуюць на зямлі: «Вельмі хачу, каб наша сяло квітнела. Мы нямала зрабілі, але мы толькі ў пачатку шляху. Вы, напэўна, асабліва апошнім часам адчулі, што такое жыць на сваёй зямлі, што такое сваё. І павінен вам сказаць, калі б не было вас, жыхароў вёскі, нам было б яшчэ цяжэй».

«Менавіта вы з'яўляецеся асновай, апорай стабільнасці нашай дзяржавы, я вам бязмерна за гэта ўдзячны, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Калі новае пакаленне вельмі хоча паспрабаваць новага жыцця — няхай. Але мы з вамі павінны пражыць гэтае жыццё ў спакоі і міры, асабліва старыя нашы. Ім хапіла, асабліва пасля вайны».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА,**

*а. г. Шаршуны.*

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Заснавальнік легендарнага брэнда Kenzo памёр ад каранавіруса



Аб гэтым паведаміла «Бі-бі-сі» са спасылкай на французскія СМІ. Кензо Такаду быў 81 год, ён памёр у амерыканскім шпіталі ў Парыжы. Францыя зараз перажывае другую хвалю каранавіруса. Напярэдадні гэтая краіна заняла трэцяе месца ў свеце па колькасці новых выпадкаў COVID-19 за суткі. Вядомы сваімі яркімі графічнымі і кветкавымі прынтамі, Кензо Такада быў першым японскім дызайнерам, які атрымаў прызнанне французскіх модных крытыкаў. Ён нарадзіўся каля Осакі, пераехаў у Францыю ў 1960-х і зрабіў там усю кар'еру. У 1970-х заснаваў сусветна вядомы брэнд Kenzo. У 1993 годзе Такада прадаў свой брэнд адзення кангламерату LVMH, а яшчэ праз шэсць гадоў пайшоў на пенсію. Заснавальнік Kenzo быў кавалерам французскага ордэна мастацтваў і літаратуры. Як адзначыў прадстаўнік Такады, японскі майстар стварыў амаль восем тысяч дызайн-канцэпцый і ніколі не пераставаў апяваць моду і мастацтва жыць. Бывайце, маэстра...

### У Швецыі стартаваў Нобелеўскі тыдзень




Пачаўся Нобелеўскі тыдзень, падчас якога вызначаць лаўрэаты гэтай прэстыжнай прэміі за 2020 год. Учора былі абвешчаны лаўрэаты па медыцыне і фізіялогіі. Узнагароды ўдастоіліся брытанскія навукоўцы Майкл Хоутан, Харві Альтэр і Чарльз Райс. Прэмію прысудзілі за даследаванні віруса гепатыту C. Нобелеўскі камітэт у Стакгольме сёння абвесціць лаўрэатаў па фізіцы, у сераду — па хіміі, у чацвер — па літаратуры. Лаўрэат прэміі за садзейнічанне ўсталяванню міру, якая лічыцца адной з самых прэстыжных узнагарод у свеце, па традыцыі будзе абвешчаны ў Осла. Цырымонія прызначаная на пятніцу. Паводле звестак Нобелеўскага камітэта, на прэмію міру сёлета прэтэндуюць 318 кандыдатаў, 211 з іх — гэта фізічныя асобы, 107 — арганізацыі. Нарэшце, 12 кастрычніка ў сталіцы Швецыі вызначыцца лаўрэат Нобелеўскай прэміі ў сферы эканомікі. Згодна з правіламі, спіс патэнцыйных кандыдатаў трымаецца ў сакрэце. Нобелеўская прэмія 2020 года прадугледжвае ўзнагароду ў 10 мільёнаў шведскіх крон (каля 1,1 мільёна долараў).

### Марс падыдзе да Зямлі на найбліжэйшую адлегласць



Паводле разлікаў навукоўцаў, 6 кастрычніка адлегласць паміж планетамі скароціцца да 62,1 млн км. Пасля яны пачнуць аддаляцца адна ад адной, і збліжэнне не паўторыцца ў наступныя 15 гадоў, паведаміў навуковы партал ScienceAlert. Чырвоная планета будзе бачная нават няўзброеным вокам, яна апынецца ў вобласці начнога неба з вельмі невялікай колькасцю зорак, што зручна для назіранняў. Арбіты Марса і Зямлі эліптычныя, таму планеты перыядычна то збліжаюцца, то аддаляюцца. Калі яны знаходзяцца на процілеглых баках ад Сонца, адлегласць паміж імі можа перавысіць 400 мільёнаў кіламетраў. Рэкорднае збліжэнне адбылося ў 2003 годзе, калі Зямлю і Марс падзялялі ўсяго 55,7 млн км. Па словах астраномаў, у апошнія гады Зямля пачала ўсё далей адхіляцца ад свайго «суседа». Гэты працэс будзе доўжыцца да 2029 года. Затым планеты зноў пачнуць рухацца насустрач, і ў 2035-м падыдуць адна да адной на 56,9 млн км. Час збліжэння планет традыцыйна выкарыстоўваецца для запуску касмічных місій на Марс. Так, сёлета паспяхова стартавалі адразу тры апараты. Наступная партыя зондаў адправіцца ў 2022-м, але ім давядзецца пераадолець дадатковыя 20 млн км, паколькі Зямля будзе знаходзіцца на адлегласці 81,5 млн км ад Чырвонай планеты.

Адкрыты дыялог

# МОЛАДЗЬ — АБ КРАІНЕ БУДУЧЫНІ

**Маладзёжны форум «Беларусь — гэта мы» прайшоў у Гродне. У ім прынялі ўдзел больш за 1200 хлопцаў і дзяўчат з усіх раёнаў вобласці: вучняў, студэнтаў, кадэтаў, спартсменаў, лідараў грамадскіх арганізацый, маладых спецыялістаў. Пляцоўкай для правядзення такога мерапрыемства стала абласная філармонія.**

— Гродна — трэці горад, куды мы прыехалі, каб даведацца аб новых ідэях і ініцыятывах, — адзначыў **першы сакратар ЦК БРСМ Дзмітрый ВАРАНЮК.** — На тэрыторыі вобласці рэалізуецца мноства самых розных праектаў, тут традыцыйна актыўны рух студэнцкіх атрадаў. Гэта паказвае і падкрэслівае той факт, што моладзь у Беларусі адзіная. Мы можам прытрымлівацца розных поглядаў і меркаванняў, але ўсе разам любім нашу Беларусь і хочам, каб яна развівалася. Спадзяёмся, што да нашай работы далучацца ўсе, і мы разам пабудуем Беларусь будучыні. Наперадзе яшчэ шмат прадметных дыскусій і гарачых дэбатаў. Пры гэтым аб'ядноўвае моладзь агульная мэта: імкненне зрабіць свет лепшым і больш добрым. Зараз у нашай краіне створана ўнікальная лічбавая платформа «Рух наперад», на якой акумулююцца пажаданні і прапановы наконт таго, як далей развіваць нашу краіну. На ёй сабрана ўжо каля паўтысячы такіх ініцыятыў. Сярод прапаноў ёсць як лакальныя, так і глабальныя, у прыватнасці такія, якія датычацца ўнясення змяненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь.

Моладзь, якая сабралася на сустрэчу, выказала сваю актыўную грамадзянскую пазіцыю ў ходзе «Адкрытага дыялогу», — канструктыўнай размовы, у працэсе якой кожны ахвотны змог выступіць з уласнымі ініцыятывамі, падзяліцца ўражаннямі і планамі на будучыню, а таксама атрымаць адказы на хвалюючыя пытанні.



Удзельнікі дыскусіі жыва цікавіліся тым, як дзяржаўная маладзёжная палітыка будзе рэалізоўвацца ў будучыні, грантавай сістэмай падтрымкі маладзёжных ініцыятыў і многім іншым. Акрамя таго, у рамках адкрытага дыялогу прысутныя высунулі цікавую ініцыятыву — напісаць зварот да нашчадкаў і закласці капсулу з гэтым пасланнем у памятным месцы Гродзеншчыны. Такая ідэя, падкрэслілі арганізатары, абумоўлена асаблівай датай, якую не так даўно адзначалі ў нашай краіне, — 100-годдзе ЛКСМБ. Абласны камітэт БРСМ ужо абвясціў конкурс на найлепшае пасланне і месца для закладкі капсулы.

На працягу ўсяго мерапрыемства працавалі інтэрактыўныя пляцоўкі. Сярод іх — «Беларусь — крыніца натхнення», «Будзь здаровы!», «Твары дабро!», «Жыві ярка!». Падчас урачыстага вечара маладыя людзі прадставілі гасцям розныя кірункі сваёй дзейнасці: студатрадаўскі і валанцёрскі рух, работу маладзёжных атрадаў аховы правапарадку і многае іншае.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

Парадак на зямлі

# ПАСАДЗІ ДРЭВА!

## Мінпрыроды заклікае далучыцца да мерапрыемстваў па азеляненні населеных пунктаў

**З кастрычніка да лістапада можна ўзяць удзел у азеляненні населеных пунктаў Беларусі. Акцыі праводзяцца ў рамках кампаніі «Добраўпарадкуем малую радзіму». Як расказаў начальнік упраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Мікалай СВІДЗІНСКІ, каб зрабіць свой унёсак у гэту добрую справу, можна звярнуцца да спецыялістаў у вобласці азелянення, каб яны падказалі прыдатныя месцы для пасадкі дрэў і кустоў, ці прапанаваць свае варыянты. Калі апошнія будуць адпавядаюць планам дэтальнай планіроўкі і не будуць парушаць інжынерныя і іншыя сеткі, гэтыя куткі таксама могуць у будучым зазеляніцца.**

Паводле інфармацыі Мінпрыроды, вясной 2020 года ў сельскіх населеных пунктах, гарадах, прыдарожных палосах было высаджана каля 267 тысяч дрэў і 135 тысяч кустоў. Гэтыя тэрыторыі не застануцца без увагі і восенню. Можна будзе прывесці іх у парадак, запоўніць пустоты на тых месцах, дзе пасаджаныя вясной расліны з розных прычын не прыжыліся.

А 10 кастрычніка 2020 года Мінпрыроды абвясціла адзіным днём азелянення. У гэты суботні дзень па ўсёй краіне будуць падрыхтаваныя месцы, дзе кожны ахвотны зможа пасадзіць маладыя дрэўцы і кусты. Актыўны ўдзел у мерапрыемствах возьмуць тэрытарыяльныя органы і структурныя падраздзяленні міністэрства.

Выклікала цікавасць у грамадскасці і сёлетняя інфармацыйная кампанія «Раскажы пра сваю крыніцу». Паводле слоў **намесніка начальніка ўпраўлення аналітычнай работы, навукі і інфармацыі Мінпрыроды Алены МЕЛЯШКОВАЙ,** на конкурс па інвентарызацыі крыніц паступіла 69 заявак, абследавана 214 такіх аб'ектаў, упершыню адкрыты 76 з іх. Яго пераможцамі сталі Юлія Якімчык, настаўнік вучэбна-педагагічнага комплексу «Пачапаўская дзіцячы сад — сярэдняя школа» Баранавіцкага раёна; Аляксандр Гіль, вучань, і Святлана Ліс, настаўніца геаграфіі гімназіі № 2 Баранавіч; Арцём Старасотнікаў, вучань мінскай сярэдняй школы № 61.

Па выніках акцыі пры ўдзеле грамадскасці і пры падтрымцы міжнароднага праекта «Водная ініцыятыва плюс» для краін Усходняга партнёрства рыхтуецца да выдання падарункавая кніга «Крыніцы Беларусі».

Акрамя таго, летась спецыялісты тэрытарыяльных органаў прыродаахоўнага ведамства з удзелам моладзі і грамадскасці добраўпарадкавалі больш за 200 крыніц. Знайшлі падтрымку ў Мінпрыроды і былі рэалізаваныя і многія іншыя грамадскія экалагічныя ініцыятывы.

Як адзначыла Алена Меляшкова, грамадскасць таксама актыўна бярэ ўдзел і ў акцыях па зборы смецця. Так, не першы год у краіне рэалізуюцца ініцыятывы руху па ўборках «Зробім!», падобныя акцыі праводзяць і прыватныя кампаніі, установы адукацыі.

— Мы таксама рэкамендуем пры правядзенні такіх уборак звяртацца ў тэрытарыяльныя органы Мінпрыроды і да мясцовых улад, — сказала прадстаўнік міністэрства. — Нашы супрацоўнікі пракансультуюць, дапамогуць спланаваць работу, падкажуць, як і куды правільна вывезці сабранае смецце.

**Вераніка КОЛАСАВА**

Здарэнні

# «П’яная» «Ямаха»

## У кіроўцы было 3,6 праміле алкаголю

**Нецвярозага кіроўцу мапеда затрымалі супрацоўнікі ДАІ ў сталіцы. Інцыдэнт адбыўся на вуліцы Высокай. Падчас нясення службы па забеспячэнні бяспекі дарожнага руху інспектары ДПС заўважылі мапед «Ямаха», які віхляў з боку ў бок. Кіроўца быў без маташлема і перавозіў пасажыра з парушэннем Правілаў дарожнага руху. Неадкладна быў пададзены сігнал аб спыненні.**

— У час размовы супрацоўнікі ДАІ звярнулі ўвагу на тое, што ў кіроўцы меліся відавочныя прыкметы ап'янення. Парушальнік не стаў адмаўляць, што сеў за руль у нецвярозым стане. Пры правядзенні агляду ў выдыханым паветры мужчыны было выяўлена 3,36 праміле алкаголю, — распавяла **старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе аддзела ДАІ Партызанскага РУУС г. Мінска Таццяна СПАДАБАЕВА.**

Незарэгістраваны і без страхоўкі мапед быў дастаўлены на ахоўную стаянку. А ў дачыненні да кіроўцы складзена некалькі адміністрацыйных пратаколаў, у тым ліку за кіраванне транспартным сродкам у стане алкагольнага ап'янення і як на не маючага права кіравання. Характэрна, што інспектары ДАІ за кіраванне транспартным сродкам у нецвярозым стане затрымліваюць мінчаніна ўжо ў чацвёрты раз.

Дарэчы, з пачатку гэтага года толькі ў Партызанскім раёне сталіцы супрацоўнікамі дарожнай міліцыі выяўлена 169 нецвярозых кіроўцаў. Дзяржаўтаінспекцыя звяртаецца да грамадзян, якія бачаць на праезнай частцы нецвярозых кіроўцаў ці пешаходаў, з просьбай паведамляць пра іх у міліцыю.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Надвор'е

# Кастрычнік, дождж, плюс 21...

## Але ўначы ўжо зусім не цёпла

**Другі тыдзень кастрычніка пройдзе пад знакам дажджоў і дастаткова цёплага надвор'я. Я нешта не прыгадаю, каб першая дэкада другога месяца восені амаль увесь час трымалася з тэмпературай каля плюс 20. А навальніцы ў ноч на панядзелак? У кастрычніку гэта даволі рэдкая з'ява, тым больш у начныя гадзіны, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У сераду ўначы і раніцай захаваецца ўплыў франтальнага раздзелу, у цэнтральных і ўсходніх раёнах краіны пройдуць дажджы, месцамі моцныя, дзе-нідзе магчымыя навальніцы. Але ўдзень дрэннае надвор'е пакіне тэрыторыю Беларусі, кароткачасовыя дажджы чакаюцца толькі месцамі па краіне. Вецер прагназуецца паўднёвы ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 7 да 14 цяпла, а ўдзень чакаецца 14—21 градус вышэй за нуль.

Новая порцыя дажджоў чакае нас у чацвер. У гэты дзень надвор'е будзе вызначаць актыўная франтальная сістэма, якая ссоўваецца з боку Украіны на тэрыторыю Беларусі. Будзе пераважаць воблачнае надвор'е. На большай частцы краіны пройдуць дажджы рознай працяглас і інтэнсіўнасці. Удзень у асобных раёнах прагрымяць навальніцы, месцамі будуць адзначацца моцныя лівні. Вецер прагназуецца паўднёва-ўсходні з пераходам на паўночна-заходні ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 8 да 14 цяпла, удзень — ад плюс 12 да плюс 19 градусаў.

У наступны дзень дажджоў паменшае, але стане халадней. У пятніцу будзе воблачна з праясненнямі. Уначы на большай частцы тэрыторыі краіны, а ўдзень па ўсходзе пройдуць кароткачасовыя дажджы. Вецер прагназуецца няўстойлівы, уначы слабы, удзень умераны. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 5 градусаў па паўднёвым захадзе да 13 цяпла па ўсходзе, удзень будзе 10—16 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў, у наступныя выхадныя франтальныя раздзелы пакінуць наш рэгіён, атмасферны ціск вырасце, паменшыцца колькасць аблокаў. Істотных ападкаў не чакаецца. Сціхне вецер. Уначы і раніцай месцамі будуць згушчацца туманы. Тэмпература паветра ўначы складзе 5—11 цяпла, у асобных раёнах пры працяглых праясненнях магчыма паніжэнне да плюс 2 — 4 градусаў. У сярэдзіне дня паветра будзе выгравацца ад плюс 12 градусаў да 18 цяпла.

Сіноптыкі фіксуюць, што ў нашай краіне ўсталявалася не па сезоне суперцёплае надвор'е. Так, у мінулую нядзелю, 4 кастрычніка, сярэднясутачныя тэмпературы на 6—10 градусаў перавысілі кліматычную норму. Прычынай таму стаў вынас вельмі цёплага няўстойлівага паветра з паўднёвых шырот.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Крымінал

# СКРАЎ З ОФІСА ШЭСЦЬ НОЎТБУКАЎ

## Пасля таго, як жонку звольнілі з работы

**Супрацоўнікі Першамайскага РУУС Мінска затрымалі на месцы злачынства мужчыну, які неаднаразова пранікаў у памяшканні і выкрадаў маёмасць.**

Затрыманым аказаўся непрацуючы 35-гадовы жыхар Гомельскай вобласці. Пры аглядзе ў мужчыны выявілі лом, кусачкі, два ліхтарыкі, маску і пальчаткі.

У ходзе размовы ён расказаў, што трапляў у офісы, зрушваючы шклопакет або разбіваючы яго. Першы крадзеж мужчына здзейсніў пасля таго, як яго жонку звольнілі з работы. Уначы ён пракраўся ў офіснае памяшканне, дзе яна раней працавала, і выкраў шэсць ноўтбукаў. Гэтую маёмасць часткова прадаў знаёмым.

Як паведамляе ГУУС Мінгарвыканкама, высветлілася, што мужчына датычны і да іншых крадзяжоў: месяц таму «па адпрацаванай схеме» ён пранік у адну з крам сталіцы і выкраў 15 бытавых інструментаў і больш за 30 розных гаспадарчых вырабаў. Агульная сума шкоды тады склала 2300 рублёў.

Падчас правядзення комплексу аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў праваахоўнікамі было ўстаноўлена, што мужчына датычны яшчэ як мінімум да сямі крадзяжоў з офісаў і крам на тэрыторыі сталіцы. Устаноўлена, што ён выкрадаў рэчы, якія ўяўлялі хоць нейкую матэрыяльную каштоўнасць: бытавыя прылады, парфумерыю, касметыку і тэхніку. Выкрадзеную маёмасць мужчына прыносіў дадому і часткова прадаваў знаёмым.

Раней затрыманы неаднаразова прыцягваўся да крымінальнай адказнасці.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў выказваюць глыбокае спачуванне родным і блізкім члена Пастаяннай камісіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы ПІСАНІКА Леаніда Фёдаравіча ў сувязі з яго раптоўнай смерцю.**

# У атмасферы пазітыву

## Рэспубліканскі аўтапрабег «За адзіную Беларусь» фінішаваў у Брэсцкай крэпасці

**Аўтапрабег, які стартаваў у суботу ранкам каля мяжы з Расійскай Федэрацыяй і прайшоў па магістралі М1/Е30, у другой палове дня дасягнуў Брэста. Удзельнікі акцыі, што пераадолелі каля паўтысячы кіламетраў, сабраліся на пляцоўцы брэсцкага аэрапорта. Тут да іх далучыліся ахвотныя брастаўчане, затым усе яны адзінай парадназ лінейкай рушылі па галоўных вуліцах Брэста ў напрамку да крэпасці. Калона расцягнулася літаральна на некалькі кіламетраў.**



Фота БелТА.

Тым часам у цэнтры Брэста на плошчы Свабоды сабраліся людзі са сцягамі і плакатамі «За Беларусь», каб выказаць падтрымку дзеючай уладзе. Яны прайшлі пад музыку ваеннага аркестра, які выконваў «Кацюшу», «Дзень Перамогі» і іншыя песні патрыятычнай тэматыкі па вуліцы Савецкай да праспекта Машэрава. Затым дэманстранты накіраваліся ў крэпасць, дзе каля галоўнага ўвахода ў мемарыяльны комплекс экіпажы ўдзельнікаў аўтапрабегу ўжо выстраіліся ў рады. Кругом панавалі ўсмешкі, луналі сцягі. Удзельнікі маршу фатаграфаваліся на памяць. Многія на мерапрыемства прыйшлі з дзецьмі, і малыя, каб добра бачыць, сядзелі на плячах у татаў.

Сцягоў было наогул вельмі многа. Яны развяваліся на машынах, укрывалі плечы ўдзельнікаў шэсця, але ж галоўным стала 100-метровае палотнішча Дзяржаўнага сцяга, якое неслі многа рук. Ад галоўнага ўвахода — зоркі — да плошчы Цырыманіялаў урачыста пранеслі дзясяткі людзей гэты сцяг-гігант. Потым былі ўскладзены кветкі да Вечнага агню, настала хвіліна маўчання ў памяць пра герайчных абаронцаў крэпасці і ўсіх змагароў за Радзіму.

Пасля ўрачыста-афіцыйных момантаў мерапрыемства яго **арганізатар Сяргей РАЧКОЎСКІ** пагаварыў з прысутнымі журналістамі.

— Усіх нас спрабуюць перакапаць, што пратэставаць гэта модна, а вось людзей, якія выступаюць за адзіную Беларусь, меншасць, яны пасіўныя і не ўмеюць адстойваць свой пункт гледжання, — сказаў суразмоўнік. — Але гэта не так. Наш першы аўтапрабег прайшоў яшчэ 21 жніўня, а цяпер фарміруецца рух, які набірае абароты. Нашы аўтапрабегі праходзяць у фармаце невялікіх сямейных падарожжаў, і галоўнае ў іх — атмасфера пазітыву, дружалюбнасці. З часам на базе гэтага руху мы плануем стварыць новае патрыятычнае грамадскае аб'яднанне.

Удзельнікі мерапрыемства разбіліся на групы і сталі ўдзельнікамі экскурсій па мемарыяльным комплексе «Брэсцкая крэпасць-герой».

**Яна СВЕТАВА.**

# Што відаць праз «адно акно»?

### КІРУНАК НА ЭЛЕКТРОННЫЯ ПАСЛУГІ

У сусветнай практыцы аказання адміністрацыйных працэдур існуе шмат падыходаў і кірункаў. Кожная краіна сама выбірае, што для яе найбольш зручна. У Беларусі сёння трэба ўдасканальваць практыку аказання адміністрацыйных паслуг. Перад намі стаіць задача па пошуку аптымальнай мадэлі аказання паслуг у краіне, расказаў **міністр юстыцыі Алег СЛІЖЭЎСКІ.**

— Адміністрацыйныя працэдуры — паслугі, якія дзяржава ў асобе дзяржорганаў аказвае насельніцтву. Безумоўна, як і любую паслугу, якасць гэтых таксама трэба ўдасканальваць у частцы хуткасці, прастаты, даступнасці. І ў гэтым плане ў лідскай службы ёсць чаму павучыцца. Пэўна не варта ствараць шматфункцыянальныя цэнтры ў кожным рэгіёне, лепш арганізоўваць службы на базе дзеючых памяшканняў, як гэта зроблена ў Лідзе. Аднак першаснай задачай на перспектыву павінна быць развіццё электронных паслуг. Мы ўсе сучасныя людзі, асабліва моладзь, і нам трэба смялей рухацца ў гэтым кірунку.

«Адно акно» ў Лідзе з 2007 года з маленькага «акенца» вырасла ў паўнавартасную службу, дзе па буднях з васьмі да пяці, у сераду — з васьмі да васьмі без перапынку на абед працуюць восем спецыялістаў. Нядаўна тут скончыўся рамонт, і цяпер, акрамя падрыхтаваных спецыялістаў і асобнага рабочага месца з выхадам у інтэрнэт для грамадзян, ёсць зручны памочнік — вялізная інтэрактыўная інфармацыйная панэль, дзе дарослыя могуць паглядзець пералік працэдур, якія ажыццяўляюцца службай, прачытаць прававыя дакументы; даведацца, якія паперы трэба сабраць, каб атрымаць рашэнне па сваім пытанні. А для дзяцей гэта яшчэ і забаўляльны гаджэт, па якім паказваюць мульцікі, пакуль бацькі занятыя. Тут жа непадалёк абсталяваны алоўкамі, размалёўкамі ды кніжкамі дзіцячы куток, запісы назірання з якога захоўваюцца цягам месяца.

— Наша задача ў рабоце з людзьмі — выканаць паслугу якасна. Падабраць кваліфікаваных спецыялістаў, якія не проста суха адкажуць чалавеку на пытанне, а дадуць яму кірунак, каб ён мог ацаніць свае сілы і магчымасці дзеля выканання задуманага. Бо не ўсе людзі сёння настолькі прасунутыя, каб пачарпнуць інфармацыю з розных крыніц і правільна яе выкарыстаць. Мы не перастаём развівацца, стараемся сістэматызаваць пытанні, — запэўніў **Сяргей ЛОЖАЧНІК, старшыня Лідскага райвыканкама.**

Штодня ў службу наведваюцца дзясяткі лідчан. Святлана і Яўген РАДЗЮКІ — адны з іх. Хочуць правесці электраацяпленне ў бацькоўскай вясковай хаце.

— Звярнуліся ў электрасеткі, каб даведацца, ці ёсць тэхнічная магчымасць зрабіць ацяпленне на электраэнергіі. Нам далі бланк, і мы прыйшлі ў службу «адно акно», каб атрымаць рашэнне. Хочам цяпер яшчэ даведацца пра магчымасць вяртання сродкаў за гэта, — кажуць сужэнцы.

— Мы ўжо сабралі дакументы на выраб тэхнічных умоў на электразабеспячэнне гэтага жылога дома. Пары прыйдзецца звяртацца ў сельсавет, каб вырашыць пытанне вяртання грошай. Таму я хачу ім максімальна расказаць, што трэба зрабіць для гэтага, — далучылася да размовы **Святлана БЯНКЕВІЧ, спецыяліст службы «адно акно», якая кансультуе пару.**

### РАБОТА АДНОЛЬКАВАЯ, ГРОШЫ — РОЗНЫЯ

У лідскім «адным акне» працуюць два дзяржслужачыя, спецыяліст з упраўлення гандлю, сацыяльнага цэнтра абслугоўвання і чацвёра работнікаў сферы ЖКГ. Значную частку дакументаў яны збіраюць самастойна. Летась адправілі 18 тысяч запытаў, каля 12 тысяч з іх — у электронным выглядзе.

Пры гэтым такой прафесіі, як «спецыялісты службы», у краіне няма. А памер заробку ў спецыялістаў істотна адрозніваецца. Пры аднолькавых функцыях зарплата дзяржслужачых «аднаго акна» і работнікаў, якіх прыцягнулі ў структуру з іншых небюджэтных і бюджэтных арганізацый, істотна адрозніваецца. Гэта адбываецца з-за таго, што ў спецыялістаў, якія бяруць з іншых структур, захоўваецца той заробак, які быў у іх на пасадзе ў «роднай» арганізацыі. Таму, акрамя асэнсоўвання таго, як удасканальваць работу самой службы, неабходна падумаць таксама над забеспячэннем справядлівых умоў працы яе спецыялістаў.

Магчыма, мэтазгодна было б зрабіць такія службы асобным структурным падраздзяленнем райвыканкамаў або ўвогуле самастойнымі арганізацыямі, каб павысіць якасць работы і садзейнічаць павелічэнню кампетэнцый і прафесіяналізму іх работнікаў. Паступілі для разгляду таксама прапановы стварaць камунальныя ўнітарныя прадпрыемствы, якія будуць рэгуляваць дзейнасць «аднаго акна» па ўсёй краіне, і павялічваць колькасць платных паслуг насельніцтву ў гэтай службе.

Над усім гэтым трэба думаць, аднак ёсць і прыклады, дзе згаданую праблему амаль вырашылі. Прынамсі, пра свой вопыт закупак паслуг работнікаў службы «адно акно» ў адной абласной арганізацыі за бюджэтныя грошы расказалі прадстаўнікі Мінскай вобласці і Фрунзенскага раёна сталіцы. Яны падкрэслілі таксама, што набіраць у службу людзей з вуліцы нельга, бо яны «трымаюць перыметр», і восем гадзін працаваць з грамадзянамі — складана, трэба ведаць шмат, быць крыху і псіхолагам, і адседзецца тут нельга.



Як удасканальваць работу службы, трэба пытацца ў саміх людзей, зыходзіць з рэальнасці, каб атрыманне даведкі не ператваралася ў свята, якое адзначалася б потым тыдзень усёй сям'ёй, агучыў Сяргей Ложачнік. Адно з пытанняў, якое паўстала на семінары і неўзабаве, магчыма, будзе рэалізавана, датычыцца пераліку паслуг службаў «аднага акна» розных узроўняў. У большасці мястэчак ён будзе павялічвацца, а вось у гарадах-спадарожніках Мінска колькасць паслуг варта паменшыць, бо шмат якія з іх незапатрабаваны людзьмі. Ёсць пытанні і па праграмным комплексе, які выкарыстоўваецца ў службе, — яго трэба дапрацаваць для больш дакладнай работы. Усе слушныя прапановы мяркуецца ўнесці як змяненні ва Указ Прэзідэнта № 200 пра адміністрацыйныя працэдуры па заявах грамадзян.

### АД «МАЛЫШОВАГА» ДА «РЫТУАЛЬНАГА»

Удасканаленне работы службы «адно акно» праз атрыманне рашэнняў па розных працэдурах у электронным выглядзе анлайн дазволіць людзям усё менш наведваць гэтыя службы фізічна. Рэалізацыі падобнай задачы садзейнічае і з'яўленне з новага года ў краіне ID-картак, дзе будзе электронна-лічбавы подпіс грамадзяніна. Такі дакумент заменіць беларусам пашпарт.

— Гэта ў цэлым стварае ўсю сукупнасць інфраструктуры, якая дазваляе аказваць адміністрацыйныя працэдуры і электронныя паслугі ў электронным выглядзе з выкарыстаннем персанальных даных і іншых неабходных інфармацыйных рэсурсаў, — адзначыў **Сяргей РУДНЕЎ, першы намеснік дырэктара нацыянальнага цэнтра электронных паслуг.** — Узаемасувязь грамадзяніна і партальных рашэнняў ажыццяўляецца з дапамогай абароненых пратаколаў, якія забяспечваюць захаванасць персанальных даных. Акрамя таго, самі інфармацыйныя рэсурсы маюць адпаведную сістэму абароны інфармацыі, якія дазваляюць убраць рызыкі, што звязаны са стратай персанальных даных.

Міністэрства юстыцыі збіраецца ўкараняць у Беларусі таксама пакетны прынцып атрымання паслуг у «адным акне». Ужо сёлета колькасць паслуг тут павялічылася да 181 замест 103. А з часам у практыку ўвойдуць і цэлыя пакеты комплексных паслуг для людзей, расказала спецыялістам **Наталля ФІЛІПАВА, намеснік міністра юстыцыі:**

— Шляхам падачы адной заявы грамадзянін будзе атрымліваць пэўны пакет дакументаў, які звязаны з яго прававым статусам. Пакуль усё гэта ў стадыі распрацоўкі, і назвы ўмоўныя. Пры нараджэнні дзіцяці, напрыклад, можна будзе атрымаць пакет «малыш». Такім чынам, падаўшы адну заяву, адразу зарэгістраваць нараджэнне немаўляці, зрабіць яго рэгістрацыю па месцы жыхарства, прызначыць дапамогу на малога, стаць на ўлік асоб, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, запісаць дзіця на чаргу ў садок, а яшчэ шмат што іншае сюды можна дадаць з вашай дапамогай. Гэта здыме з грамадзян вялізную нагрузку, калі перад кожнай працэдурай трэба рыхтаваць стос дакументаў, якія часткова дублююцца.

Прадугледжаны і асобны пакет для шматдзетных сем'яў. Сюды, акрамя пералічаных вышэй дакументаў, можна дадаць атрыманне сям'ёй даведкі пра атрыманне статусу шматдзетнай, уключэнне ў спісы, атрыманне дазволу на будаўніцтва, крэдыты, субсідыі, мацярынскі капітал і іншае.

З пакетам «маладажоны» ў дзень рэгістрацыі шлюбу адразу маладая жонка можа змяніць прозвішча (калі хоча) і замяніць пашпарт, сужэнцы могуць стаць на ўлік як маладая сям'я і іншае. Пакет «хачу офіс» дапаможа вырашыць пытанні пераводу жылога памяшкання ў нежылое, узгадніць перапланіроўку, атрыманне дазволу на ўстаноўку кандыцыянера і іншыя моманты. Пакет «рытуальны» ўключае атрыманне даведкі на пахаванне, выдзяленне ўчастка для пахавання, грашовай дапамогі і іншыя пытанні.

Мяркуецца, што да 2024 года каля 300 працэдур у Беларусі можна будзе атрымліваць у электронным выглядзе ў асабістых анлайн-кабінетах грамадзян. аднак фізічныя службы «адно акно» не знікнуць, запэўніваюць у Мінюсце, бо ёсць тыя, хто не карыстаецца інтэрнэтам, і спецыяліст «аднаго акна» застанецца пасрэднікам паміж чалавекам і электроннай паслугай, які падасць адпаведны запыт на адміністрацыйныя рашэнне са згоды і ад імя грамадзяніна.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Добрая справа

# САРТАВАЦЬ СМЕЦЦЕ МОЖНА ТВОРЧА

## Як у Слаўгарадзе, што на Магілёўшчыне, за год навучыліся паасобнаму збору цвёрдых камунальных адходаў

**З першага верасня несці на сметнік несартаваныя адходы забараняецца. Гэта не дазваляе рабіць уступленне ў дзеянне тэхнічнага кодэкса «Правілы абыходжання з камунальнымі адходамі». У адпаведнасці з ім пластык, папера і шкло павінны адпраўляцца ва ўтыль асобна, інакш можна атрымаць адміністрацыйнае пакаранне.**





### Экалогія перадусім

У Слаўгарадзе ўжо год жывуць па новых правілах. І гэта нікога не напружвае. Хутчэй, наадварот. Насельніцтва на справе пераканалася, што такі падыход сапраўды дапамагае не толькі захоўваць парадак, але і палепшыць экалогію. Летась жыхары прыватных домаўладанняў атрымалі ў сваё карыстанне набор з дзвюх ёмістасцяў: жоўтыя — для збору шкла, пластыку, паперы, чорныя — для астатняга смецця. Мінскі аператар другасных рэсурсаў перадаў слаўгарадскім камунальнікам больш за 4 тысячы такіх скрынь, а тыя развезлі іх па адрасах. Адначасова з вуліц прыбралі металічныя кантэйнеры, куды раней складзіравалі смецце. І хоць вываз ажыццяўляўся па графіку, непрыемныя пахі, бадзяжныя жывёлы, розны бытавы хлам каму заўгодна маглі сапсаваць настрой. Усё змянілася дзякуючы рэспубліканскай праграме «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе».

— Першы час было, вядома, цяжкавата, жыхары прымалі змены трохі насцярожана, — кажа **эколаг Слаўгарадскага камунальнага прадпрыемства «Жылкамгас» Ірына РАГОЎСКАЯ.** — І хоць пры перадачы маёмасці ўручалася памятка і тлумачылася, навошта гэта і для чаго, не ўсе адразу зразумелі, менавіта ў чым перавага. Прыйшлося праводзіць навучанне, расказваць, чаму смецціва чорных і жоўтых кантэйнераў вывозіцца паасобна, куды ўсё гэта накіроўваецца. Адходы з чорных скрынь цалкам утылізуюцца, а з жоўтых — канчаткова сартуюцца на асобнай пляцоўцы смеццевага палігона. ПЭТ-бутэлька тут жа прэсуецца і адвозіцца ў Магілёў на прадпрыемства «Рэпласт-М», папера таксама ў прэсаваным выглядзе адвозіцца ў Шклоў на завод «Спартак», а шкло прымае ў Магілёве ААТ «Белрэсурсы».

### Акцыі, майстар-класы, анкеты

У справе вырашана было задзейнічаць дзяцей. Па-першае, яны прывыклі заўсёды дзяліцца новай інфармацыяй з бацькамі, па-другое, варта прывучаць да культуры збору бытавых адходаў з юных гадоў. На камунальным прадпрыемстве склалі план інфармацыйна-асветніцкай дзейнасці сярод устаноў адукацыі Слаўгарадскага раёна, які быў узгоднены з аддзелам спорту і турызму Слаўгарадскага райвыканкама і ДУ «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў». У кіраўніцтве да дзеяння 13 мерапрыемстваў — конкурсы, інфармацыйныя гадзіны, акцыі, майстар-класы, сумесныя зборы другаснай сыравіны, экскурсіі і гэтак далей.

Тры мерапрыемствы з гэтага плана ўжо рэалізаваныя. Яшчэ ў жніўні старшакласнікі Слаўгарадскай школы № 1 разам з карэспандэнтам раённай газеты правялі на вуліцах горада анкетаванне на тэму паасобнага збору цвёрдых камунальных адходаў і раздалі каля двухсот брашур з парадамі.

— Для некаторых інфармацыя пра карысць сартавання смецця стала адкрыццём, — кажа Ірына. — Калі чалавек робіць нешта неўсвядомлена, ён звычайна не задумваецца пра наступствы. Пасля апытання ў многіх кардынальна памянялася мысленне. Людзі ўбачылі праблему з іншага боку.

На «ўра» прайшло яшчэ адно мерапрыемства: «Мы за свет без адходаў». У выніку яго ў некалькіх кіламетрах ад Слаўгарада на бетоннай сцяне палігона для цвёрдых бытавых адходаў з'явіўся незвычайны арт-аб'ект — малюнкі на актуальную тэму.

— Мясцовыя мастакі стварылі эскізы, а школьнікі іх размалявалі, — тлумачыць эколаг. — Аб'ект знаходзіцца ў непасрэднай блізкасці ад дарогі Слаўгарад — Рагачоў, за дзень міма яго праязджаюць сотні машын. І не заўважыць творчы плён нашых юных сяброў немагчыма. Карцінкі вельмі яркія і прыцягваюць увагу.

А зусім нядаўна «Жылкамгас» арганізаваў для сямікласнікаў паездку на смеццеперапрацоўчы завод у Магілёве. Школьнікі былі сапраўды ўражаныя.

— З імі правялі інструктаж, выдалі каскі, маскі і паказалі ўвесь шлях перапрацоўкі смецця — ад арганізацыі ўліку да стварэння новай прадукцыі, — кажа Ірына. — Тую ж ПЭТ-бутэльку завод перапрацоўвае ў гранулы.

Экскурсію правёў **галоўны тэхнолаг смеццеперапрацоўчага завода Аляксей СФЕРАЎ.**

— У апошні час у нас часта бываюць школьнікі і нават выхаванцы дзіцячых садкоў, — кажа ён. — Сёння гэта вельмі актуальная тэма. Мы нікому не адмаўляем, для ўсіх праводзім экскурсіі. Дзецям усё цікава, яны ўсё ўбіраюць як губка. Тлумачым ім, што раней была лінейная эканоміка і адходы наогул не перапрацоўваліся, зараз рэцыклінгавая, гэта значыць адбываецца вяртанне другаснай сыравіны і яе перапрацоўка, а ў будучым будзе цыркулярная эканоміка — поўная перапрацоўка адходаў. Як ні дзіўна, але дзеці досыць складаныя паняцці вельмі хутка запамінаюць. Гэтыя веды для падрастаючага пакалення вельмі важныя. Сёння выпускаецца шмат палімераў, якія не перапрацоўваюцца па розных прычынах — той жа аднаразовы посуд, поліэтыленавыя пакеты. Ад гэтага мы будзем паступова адыходзіць. Сёння ў свеце выраблялецца больш за 350 мільёнаў тон пластыку, з якога другаснай перапрацоўцы падвяргаецца 8 %, яшчэ 12 % — спальваецца, а ўсё астатняе ідзе ў зямлю. Гэта вялікі ўдар па нашай экалогіі.

### «Цывілізацыя» для глыбінкі

У Слаўгарадзе навялі парадак не толькі ў прыватным сектары, але і ў раёне шматпавярховай забудовы. Зусім нядаўна ў дадатак да ўжо наяўных еўракантэйнераў «Жылкамгас» атрымаў яшчэ 66 — па 22 адзінкі для пластыку, паперы і шкла.

— Аператар дае нам банеры, кантэйнеры, транспарт, дапамагае з рэкламнымі буклетамі — усё робіцца для таго, каб выхаваць у людзей культуру абыходжання з цвёрдымі камунальнымі адходамі, — заўважае **намеснік дырэктара Слаўгарадскага «Жылкамгаса» Дзмітрый ЛУГАЎЦОЎ.** — Змены відавочныя. На кантэйнерных пляцоўках стала больш парадку. Жыхары ўжо не складваюць там буйнагабарытныя рэчы, а заказваюць тэхніку для вывазу. Гэта нашмат палягчае нашу працу. Радуе, што насельніцтва пачало ставіцца да пытання сартавання адходаў з разуменнем. Гэта вынік нашай вялікай асветніцкай работы. Інфармацыя даецца ў раённай газеце, на радыё — людзі ўсё чуюць і робяць высновы. У школе вядзецца тлумачальная работа сярод дзяцей. У выніку стала больш збірацца другаснай сыравіны. Гэта дае добры эканамічны эфект.

У наступным годзе «цывілізацыя» прыйдзе і ў сельскую мясцовасць.

— Плануем атрымаць на найбольш буйныя населеныя пункты Слаўгарадскага раёна кантэйнеры і дадатковыя смеццявозы, — кажа Ірына. — А раённы аддзел адукацыі абяцае дапамагчы нам наладзіць работу з сельскімі школьнікамі. Разам мы зможам зрабіць шмат карыснага. Такі спосаб работы даказаў сваю эфектыўнасць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Фота з архіва Слаўгарадскага камунальнага прадпрыемства «Жылкамгас».**

# СТАДЫЁН-ТРАНСФОРМЕР

## Спартыўны аб'ект у Шчучыне пасля рэканструкцыі стане яшчэ і канцэртнай пляцоўкай

**Тут замахнуліся на даволі сур'ёзны праект. Першы крок зроблены ў рамках праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва. На рэканструкцыю выдзелена 500 тысяч еўра, але гэтых сродкаў не хопіць на ўвесь комплекс работ. Таму маюцца спадзяванні на бюджэт і спонсарскую дапамогу.**

Як расказаў **загадчык сектара спорту і турызму аддзела адукацыі Шчучынскага райвыканкама Дзмітрый КІРЫЛАЎ,** гарадскому стадыёну «Алімп» амаль трыццаць гадоў. Час адбіўся на стане аб'екта. Праўда, гадоў пяць таму частковая рэканструкцыя ўсё ж была праведзена. Але праблема канчатковага добраўпарадкавання стадыёна не вырашана.

Літаральна два гады таму заяўка аб рэканструкцыі «Алімпа» была ўключана ў еўрапейскі праект. У адпаведнасці з апошнім стадыён павінен стаць не толькі спартыўным, але і культурным аб'ектам. Гэта значыць ён павінен поўнасцю змяніцца, прычым як унутры, так і знадворку. У сувязі з гэтым будзе добраўпарадкавана навакольная тэрыторыя — перад фасадам з'явяцца сучасная тратуарная плітка і зялёныя газоны, будуць устаноўлены новыя лаўкі.

Мяркуецца, што стадыён павінен стаць «трансгранічным цэнтрам дыялогу культур Польшчы — Беларусі — Украіны». Таму ў рамках праекта будзе закуплена модульная сцэна, якую пры неабходнасці можна будзе зманціраваць і ўстанавіць на стадыёне падчас правядзення канцэртаў творчых калектываў Беларусі і краін-партнёраў. Дарэчы, кошт разборнай сцэны і гукавога абсталявання складае 60 тысяч рублёў. А вялікі лічбавы экран каля футбольнага поля памерам тры на шэсць метраў будзе выкарыстоўвацца не толькі як табло, але і для трансляцыі канцэртаў.

Частка работ выраба за кошт сродкаў трансгранічнага праекта. Транш склаў 500 тысяч еўра. Можна ўбачыць, як мяняецца аблічча старэйшага гарадскога стадыёна. На трыбунах замест былых лавак з'явіліся новыя яркія пластыкавыя сядзенні на 3,6 тысячы чалавек. Усе яны знаходзяцца пад водаахоўным навесам. Шмат патрэбнага зроблена таксама ўнутры будынка. Адбылася замена ўсёй электраправодкі і каналізацыйнай сістэмы. Адрамантаваны душавыя і санвузлы, а таксама трэнерская і бытавыя памяшканні. Зразумела, туды завезена і новая мэбля, устаноўлены шафкі ў распранальнях.

Тогда молодую женщину спасли в областной больнице. Но у нее начались проблемы с памятью. Полный процесс восстановления памяти занял почти пять лет. Помог доктор из Кисловодска, встреченный в санатории. Именно он подсказал методику, которая повлияла на восстановление утраченного и которой Мария Петровна пользуется до сих пор как инструментом для тренировки памяти. А до этого было тяжело. Рассказывала, как первый год после болезни пыталась сама исправить ситуацию, без конца заучивала новые четверостишия, а через полчаса их напрочь забывала, и это ввергало в отчаянье. Но теперь она ко всему относится по-другому, считает, что любое испытание дается не зря. Ведь как хорошо знала своих сельских учеников, но не подозревала, сколько в сельских ребятах, успевающих и не очень, человеческого благородства... Первый год после той операции она не работала. А когда пришла на уроки, случались вот эти провалы в памяти. К примеру, учительница увлеченно рассказывает тему и вдруг резко замолкает, потому что забывает, теряет мысль. Через несколько секунд или минуту все возвращается, но во время ее молчания ученики сидят тихо-тихо, не шелохнувшись. Теперь это трогательное и трепетное воспоминание. Значит, все было не зря.

«Сегодня я благодарна судьбе за то, что вижу своих взрослых, состоявшихся в жизни детей, внуков, у меня уже два правнука. И когда пришлось помогать внучке нянчить ее маленького сына (до обеда нянчить, а после обеда читать лекции студентам-историкам), тоже воспринимаю это как подарок судьбы.

Но, кроме семьи, у меня всегда было дело, которым я увлечена. Я была увлечена им всю жизнь и старалась делать его хорошо, — продолжает Мария Жигалова. — Это говорю для более молодых — тех, кто часто сомневается и бросает что-то на полпути. Важно в жизни не отступать и верить, что все получится».

Профессор кафедры белорусского и русского языков БрГТУ сегодня живет стремительно, ярко, насыщенно, обладает большой силой притяжения и во многом является загадкой для окружающих.

**Светлана ЯСКЕВИЧ.**

**Фото из архива героини.**

# «ГОЛОС У БИЗНЕСА ДОЛЖЕН БЫТЬ ЗВОНКИЙ И ЖЕСТКИЙ»

## С такой просьбой обратился к промышленному сообществу член Коллегии — министр по техническому регулированию ЕЭК Виктор Назаренко на совместном заседании деловых советов Беларуси и России в рамках VII Форума регионов двух стран

**Он пояснил журналистам, что вопрос сотрудничества Беларуси и России актуален не только для целей Союзного государства, но и для ЕАЭС. «Потому что две страны наиболее активно поднимают всю проблематику, задают тон дискуссии на площадке ЕАЭС», — аргументировал он.**

Виктор Назаренко подчеркнул, что в год своего председательства в ЕАЭС Беларусь уделяет большое внимание снятию барьеров во взаимной торговле. Но эта задача, по его мнению, должна решаться неразрывно с защитой общего рынка от опасной и контрафактной продукции. «Надо открывать рынок добросовестным производителям, безопасному и качественному товару, и закрывать для недобросовестного импорта», — сказал он журналистам.

На Деловом совете министр ЕЭК обратил внимание, что наш регион находится под достаточно внушительным давлением продукции третьих стран. По его мнению, члены интеграционного объединения оказались не готовы к такому агрессивному импорту, не смогли выйти на интегрированное взаимодействие национальных систем прослеживаемости товаров, да и сами системы эти не функционируют в полной мере, есть только их отдельные элементы. «Для нас очень сложно разделить импорт на тот, который имеет право находится на нашем рынке и тот, который должен был бы остаться на своей территории», — сказал представитель Евразийской экономической комиссии.



Фото Яна ХВЕДЧИНА.

Стратегическая задача стран «пятерки» — выйти на единую политику в сфере технического регулирования, подчеркнул Назаренко, но страны идут к этому очень неохотно, большинство полномочий оставляют у себя, что усложняет выход на единую, прозрачную систему регулирования.

«Все держится на стандартизации, но уровень гармонизации с международными стандартами еще по многим видам продукции далек от желаемого, — констатировал министр ЕЭК. — Мы хотели бы, чтобы весь наш бизнес понимал, что уровень стандартов должен быть таким, который бы позволял работать на своем рынке и поставлять продукцию на внешние».

Отдельно Виктор Назаренко остановился на проблемах во взаимодействии членов экономической интеграции. Кроме отличий в законодательствах и недостаточном желании сторон переходить на единые подходы, еще одна проблемная зона — двойное регулирование и двойная нагрузка на промышленность. В частности, это касается переработчиков молочной продукции.

«Когда мы имеем дело с проблемами двойного регулирования, перегрузки, сразу сталкиваемся с проблемой превышения, смешивания полномочий, когда надзорные структуры из одной сферы принимают меры в другой», — сказал Виктор Назаренко.

Он обратился к представителям бизнеса: «Голос промышленности должен быть очень звонкий и жесткий. Все должно быть четко регламентировано, все уполномоченные органы, наделенные определенными возможностями принимать решения, должны работать каждый в своей сфере».

Министр обратил внимание на то, что между странами нет системных согласованных действий по противодействию контрафактной продукции. «Тема противодействия контрафакту и небезопасной продукции заслуживает внимания со стороны бизнеса, — заявил он. — Один из инструментов — предотвращение выдачи безосновательных разрешительных документов. У нас на зарубежную продукцию принято два миллиона серийных деклараций, выдано больше 300 тысяч серийных сертификатов. Мы очень сомневаемся, что такое количество зарубежных субъектов хозяйствования поставляют продукцию на нашу территорию».

По его словам, ЕЭК пытается заставить всех работать по прозрачной схеме, но при этом не хватает позиции самого промышленного сообщества, в интересах которого это делается.

«Представители третьих стран работают очень согласованно: не успеет появиться изменение в технический регламент, они уже возмущаются, что оно создает им какие-то барьеры, — заметил Назаренко. — Вместе с тем мы не имеем консолидированной позиции нашего промышленного сообщества. Поэтому мы приглашаем вас к тесному сотрудничеству и при формировании единых требований, и при подготовке межгосударственных стандартов, и по разработке подходов по ужесточению соответствия, и по закрытию недобросовестных органов по оценке соответствия, и по созданию деловой среды, где можно было бы все эти проблемы обсуждать».

Стратегия развития интеграции, которая разработана в Евразийском союзе, включила в себя все больные места. Но для того, чтобы они были разрешены, нужно участие бизнеса, подчеркнул министр.

**Ольга МЕДВЕДЕВА.**

# ТОРГОВЛЯ ДО ИНДИИ ДОВЕДЕТ

## Кто они — желаемые и реальные партнеры ЕАЭС?

**Что даст ЕАЭС зона свободной торговли с Монголией и Индонезией? Каков эффект почти годовой работы такого соглашения с Ираном? Что ЕАЭС может предложить Индии в плане сотрудничества? Ответы на многие вопросы, связанные с торговлей, дал профильный член Коллегии (министр) Евразийской экономической комиссии Андрей СЛЕПНЕВ во время онлайн-видеомоста Москва — Ереван — Минск — Нур-Султан в мультимедийном пресс-центре Sputnik Беларусь.**

Па его словам, сейчас многие страны и объединения анализируют дальнейшую жизнь после пандемии и переоценивают риски в международной торговле. Кроме того, рвутся выстроенные цепочки, государства вынуждены делать производственные запасы по сырью. В этой связи некоторые страны уже излагают политику замкнутости. Свой ответ готовит и ЕАЭС.

«Мы, являясь самодостаточным и самообеспеченным объединением по основным ресурсам и по позициям, где должна быть создана безопасность, развиваем программы импортозамещения и усиливаем свою устойчивость. Вместе с тем мы исходим из того, что надо расширять, преодолевать тенденцию замкнутости», — сказал министр.

От пандемии, по его словам, пострадала торговля по сырьевым группам товаров. «Что касается физических объемов производства, в целом они сохранились. В то же время у нас (в ЕАЭС) существенно снизились поставки автомобилей — как грузовых, так и легковых. Спрос уменьшился со стороны коммерческих и частных потребителей, что является глобальной тенденцией», — заметил Андрей Слепнев, подчеркнув, что это тревожный сигнал — в отрасли трудятся миллионы человек.

Относительно положительных изменений — идет рост по позициям, связанным с фармацевтикой и здравоохранением. Радует и спрос на продовольственные позиции. Под воздействием пандемии торговля ведет себя по-разному.

«Наш собственный опыт показывает, что в связи с рисками пандемии торговля ведется по-разному. По данным ВТО, международная торговля рухнет на 36 %. Мы видим, что наш торговый оборот по итогам семи месяцев с внешним миром снизился тоже достаточно существенно, но это не 30 %, это 17 %, а по поводу снижения торговли внутри союза, это 13 %», — заявил министр.

Сегодня в союзе действует три торговых соглашения с Вьетнамом, Китаем и Ираном, на стадии ратификации — договоры с Сербией и Сингапуром.

Например, эффект отношений с Ираном оценить сложно, ведь соглашение вступило в силу меньше года назад. Но работа с иранскими партнерами идет активно. ЕАЭС готовит решение для перехода к иным переговорным процессам, которые позволят более детально урегулировать режим торговли и устранить существующие барьеры.

По словам Андрея Слепнева, с Вьетнамом в 2017 году рост по товарообороту составил 17 %, экспорт вырос на 40 %. В 2019 году был определенный провал, а в 2020 на фоне падения виден рост товарооборота на 3 % и наш экспорт увеличился на 16 %.

«Мы видим, что соглашение работает. То же самое и с Китаем. Хотя у нас нет какого-то обнуления пошлин. У нас есть системное соглашение. Мы видим, что снижение товарооборота с нашим ключевым партнером составило только 6 %. И его доля в нашей торговле повысилась до 20 %», — сказал министр.

Он отметил, что союз в свое время несколько отстал от тенденции заключения договоров о свободной торговле. Но это и преимущество, потому что ЕАЭС может использовать этот потенциал для роста сегодня. На данный момент ведутся переговоры с Египтом, Израилем и Индией. Если переговоры с Египтом уже достаточно продвинулись, то с Индией только приступают к реальным контактам.

«Мы видим и ценим реакцию индийских партнеров, которые сейчас пересмотрели повестку своих переговоров и по факту оставили переговоры только с нами, европейцами и американцами», — отметил Андрей Слепнев.

В свою очередь, страны ЕАЭС могут предложить Индии продукцию сельского хозяйства, кондитерские изделия. А в промышленности, по словам Андрея Слепнева, нет отраслей, которые не имеют перспективы, тем более учитывая планы страны по модернизации инфраструктуры и развитии экономики. «Мы видим, что наши предприятия могут помочь в реализации этой программы как поставками, так и через кооперационные связи. Наверное, развитие кооперационных связей является ключевым моментом этого соглашения», — добавил он.

Большие перспективы в сотрудничестве ЕАЭС с Монголией и Индонезией, которая стала важнейшим партнером в АСЕАН. «Сегодня у нас на долю Вьетнама и Сингапура, с кем уже установлены преференциальные отношения, приходится 48 % нашей торговли с АСЕАН. А если мы заключим сделку с Индонезией, уже 65 % объединения будет покрыто режимом свободной торговли. Мы рассчитываем, что это даст серьезный импульс нашему бизнесу, который, несмотря на удаленность региона, будет активно туда выходить», — заявил член Коллегии и отметил, что планы ЕАЭС данными странами не ограничиваются.

**Мария ДАДАЛКО.**

# ДОРАГА-БАГАТА

**У нашы дні па тым, што надзета на чалавека, досыць складана скласці ўяўленне аб узроўні яго даходаў. І гэта асабліва прыкметна, калі казаць аб упрыгажэннях: сёння ў модзе біжутэрыя — недарагія вырабы з некаштоўных металаў. Іх ахвотна носяць і старшакласніцы, і паспяховыя дамы за сорак. Ювелірныя ўпрыгажэнні, здаецца, сталі менш актуальныя — сучасныя жанчыны лёгка абыходзяцца без іх. Але прадаўцы ювелірных крам сцвярджаюць, што гэта не так.**

— Зразумела, што ювелірныя вырабы — далёка не прадмет першай неабходнасці. Але ж людзі працягваюць гуляць вяселлі — а значыць, будуць купляць шлюбныя і заручальныя пярсцёнкі. Заручальны — гэта пярсцёнак, які дорыцца дзяўчыне падчас прапановы рукі і сэрца, і яго носіць толькі яна, а шлюбныя пярсцёнкі — і яна, і ён. У апошні час заручальныя пярсцёнкі сталі часткай вясельнай традыцыі і ў Беларусі. Дзяўчынкам, калі праколваюць вушкі, па-ранейшаму прынята дарыць першыя завушніцы з золата. Ну, і ювелірныя ўпрыгажэнні па-ранейшаму застаюцца выдатным падарункам каханай жанчыне на любое свята, — кажа **Марына КУДРЫЦКАЯ, прадавец ювелірнага аддзела** ў адным з гандлёвых цэнтраў сталіцы.



## ШТО ЛЮБЯЦЬ БЕЛАРУСКІ?

Нягледзячы на ўзрушэнні і катаклізмы, на якія, мабыць, занадта багатая наша гісторыя, у многіх сем'ях захаваліся «бабуліны куфэркі» з залатымі завушніцамі і пярсцёнкамі. Звычайна ўнучкі такія рэліквіі захоўваюць як памяць і надзяваюць рэдка. Ну, ці аддаюць у ювелірную майстэрню, каб зрабіць з бабулінага пярсцёнка нешта больш сучаснае. Лічыцца, што золата і каштоўныя камяні — гэта свайго роду «канстанта», «вечныя каштоўнасці». Сапраўды, ёсць ювелірныя ўпрыгажэнні «па-за часам» — іх адрозніваюць простыя формы і дэмакратычны дызайн, не ўскладнены дадатковым дэкорам. Такія ювелірныя вырабы добра выглядаюць і ўдзень, і ў вячэрнім вобразе. Але і ў ювелірнай сферы існуе мода, хай і не такая зменлівая, як у сферы біжутэрыі. Яе заканадаўцамі сёння з'яўляюцца ювелірныя сталіцы свету — Ганконг і Тайланд. Раз на год у Ганконгу праходзіць сусветная ювелірная выстаўка — там нараджаюцца ідэі, якія потым «раз'язджаюцца па свеце», адаптуючыся ў кожнай краіне пад мясцовыя густы.

— Беларускі рынак у асноўным аддае перавагу спакойным, няяркім і някідкім упрыгажэнням: вырабы небуйныя, камяні невялікія. Вячэрнія ювелірныя калекцыі ў беларускіх ювелірных крамах прадстаўлены не занадта шырока, таму што не вельмі запатрабаваныя, — адзначае суразмоўніца.

Хоць, як расказалі мне, бываюць выключэнні з правіла: каля чатырох гадоў таму ў адной з мінскіх ювелірных крам было прададзена кальё з брыльянтамі за амаль 5 тысяч долараў — вячэрняе ўпрыгажэнне. Але ў цэлым вячэрнія аксесуары нашы жанчыны звычайна купляюць у аддзелах біжутэрыі, а не ў ювелірных крамах.

**«Нашы жанчыны хочуць быць прыгожымі заўсёды. І калі прыбіраюць пакой або мыюць посуд, і калі капаюць бульбу, і калі пякуць пірагі, яны, здараецца, не здымаюць з пальцаў пярсцёнкі. А ювелірныя ўпрыгажэнні прызначаныя, каб адзяваць іх "на выхад", а дома зняць і пакласці ў куфэрак...»**

Цікавы нюанс: беларускія жанчыны, як і расіянкі, любяць так званы «англійскі замок» у завушніцах. У калекцыях жа для Заходняй Еўропы завушніцы выпускаюцца звычайна з замком тыпу «цвічкі» — ён больш падабаецца еўрапейскім жанчынам.

Калі казаць пра камяні, то, па словах прадаўцоў ювелірных вырабаў, нашы жанчыны любяць тапазы — блакітныя, празрыстыя і не вельмі дарагія. У славянскіх краінах з усіх каляровых камянёў тапаз наогул найлепш прадаецца: ён падыходзіць пад найбольш распаўсюджаны ва Усходняй Еўропе колератып «лета» і пасуе практычна ўсім славянкам без выключэння. Сталыя жанчыны просяць памерыць пярсцёнкі і завушніцы з рубінамі. З імі часцей за ўсё прадаюцца пярсцёнкі вялікіх памераў — іх купляюць дамы ва ўзросце.

— Рубіны ў модзе ўжо некалькі сезонаў, але гэтыя камяні могуць пры няправільным выкарыстанні зрабіць вобраз «старамодным», — гаворыць Марына. — Каб стыльна насіць іх маладой дзяўчыне, трэба дэталёва прадумваць свой вобраз.

Самы далікатны з каштоўных камянёў — ізумруд — таксама падабаецца нашым жанчынам, але, аказваецца, з ім узнікаюць праблемы. Справа ў тым, што кольцы і завушніцы з ізумрудам патрабуюць вельмі беражлівых адносін — ён лёгка трэскаецца, дае сколы, яго нескладана падрапаць.

— Нашы жанчыны хочуць быць прыгожымі заўсёды. І калі прыбіраюць пакой або мыюць посуд, і калі капаюць бульбу, і калі пякуць пірагі, яны, здараецца, не здымаюць з пальцаў пярсцёнкі. А ювелірныя ўпрыгажэнні прызначаныя, каб адзяваць іх «на выхад», а дома зняць і пакласці ў куфэрак. Калі насіць іх пастаянна, камяні могуць парэпацца (асабліва гэта датычыцца ізумрудаў), а могуць змяніць колер — яны ж таксама пэцкаюцца...



Калі гаварыць пра колеры, якім аддаюць перавагу нашы жанчыны, мне расказалі, што, напрыклад, у ювелірнай калекцыі ў срэбры з крышталямі Сварoўскі добра прадаваліся ўпрыгажэнні ў блакітным і зялёным колерах. А вось з аранжавымі крышталямі — не пайшлі, нягледзячы на тое што ў нас нямала дзяўчат і жанчын з рудымі або каштанавымі валасамі і карымі вачыма.

## ЯК ВЫБІРАЮЦЬ «ЮВЕЛІРКУ»?

Ці купляюць у Беларусі брыльянты? Уявіце сабе, бывае і гэта.

— Кошт ювелірных вырабаў з дыяментамі не заўсёды неверагодна высокі. Напрыклад, заручальны пярсцёнак з брыльянтам можна знайсці нават за 400 рублёў. Так, гэта будзе вельмі маленькі каменьчык. Але не «асколкі», як часам кажуць пакупнікі. Такога паняцця, як «асколкі брыльянта», у ювеліраў няма.



**«Самы далікатны з каштоўных камянёў — ізумруд... Кольцы і завушніцы з ізумрудам патрабуюць вельмі беражлівых адносін — ён лёгка трэскаецца, дае сколы, яго нескладана падрапаць».**

Брыльянт ювеліры ацэньваюць па чатырох крытэрыях, якія і вызначаюць кошт каменя: памер, колер, чысціня і група агранкі. Неспецыялістам здаецца, што ўсе брыльянты белыя, на самай жа справе колер гэтага каменя ювеліры ацэньваюць па шкале ад 1 да 9, дзе адзінка — абсалютна белы камень, а чым бліжэй да 9, тым больш у яго колеры жаўцізны. Больш жоўтыя брыльянты традыцыйна спалучаюць з чырвоным золатам — тады жоўтае адценне не так прыкметнае. У белым і жоўтым золаце камень звычайна белы, а значыць, выраб даражэйшы. Чысціня каменя — гэта адсутнасць дэфектаў, расколін, газавых бурбалак. Класічная агранка брыльянта — 57 граняў, спрошчаная — 17 граняў.

Як пакупнікі выбіраюць «ювелірку»? Зразумела, што доўга і ўдумліва — пакупка ж нятанная. Мераюць, сыходзяць і вяртаюцца па некалькі разоў. Але бываюць, уявіце сабе, і ў гэтай сферы спантанныя пакупкі.

— Некалькі гадоў таму на Новы год у Серабранцы ў ювелірным аддзеле гіпермаркета мужчына купіў у падарунак завушніцы амаль за паўтары тысячы долараў (у рублёвым эквіваленце, зразумела). Дзіўна: здавалася б, калі збіраешся выбраць дарагі ювелірны выраб, ідзеш куды-небудзь у цэнтр горада, у «круты» магазін на Нямігу або на Карла Маркса. А ён прыбег 31 снежня раніцай, купіў прадукты і — па завушніцы для жонкі.

Дарэчы, адна з тэндэнцый ювелірнай моды, якая ўжо досыць доўга на піку папулярнасці, — залатыя і сярэбраныя вырабы ў незвычайных, нестандартных формах, з эмаллю, падобныя на біжутэрыю. У Еўропе такія вырабы запатрабаваныя. Нашым пакупнікам, распавядаюць спецыялісты, гэта не асабліва цікава: калі прапануецца, напрыклад, залатое ўпрыгажэнне з эмаллю, якое на першы погляд выглядае не як золата, а ты мусіш плаціць за гэты выраб як за золата — вялікай зацікаўленасці ў падобным няма.

## А КАЛІ ТАННЕЙ?

У ювеліраў існуюць хітрасці, якія дазваляюць адчувальна знізіць цану на ювелірны выраб. Напрыклад, так званыя пустацелыя ланцужкі (такія нярэдка прывозяць дадому з курорта). Звяно ланцужка ўсярэдзіне не напоўнена золатам, а ўяўляе сабой пустую трубачку. Такія ланцужкі ў носцы менш практычныя, яны рвуцца, а «кольцы» ланцужка дэфармуюцца. У пярсцёнках вытворца можа эканоміць метал на «шынцы». «Шынкай» ювеліры называюць адваротны бок пярсцёнка. Гэты адваротны бок робіцца тонкі, а асноўная маса металу выкарыстоўваецца на добрую частку пярсцёнка, якую мы бачым, калі ён на пальцы. Але праблема ў тым, што такая ненадзейная «шынка» можа лопнуць або пагнуцца — наўрад ці такое ўпрыгажэнне праслужыць доўга і вы зможаце перадаць яго ў спадчыну дачцэ або ўнучцы.

**«Заручальны — гэта пярсцёнак, які дорыцца дзяўчыне падчас прапановы рукі і сэрца, і яго носіць толькі яна, а шлюбныя пярсцёнкі — і яна, і ён».**

У завушніцах, каб зрабіць выраб таннейшым, вытворца можа палегчыць шлензу — частку замка, якая хаваецца за вухам. І ў гэтым выпадку таксама ёсць верагоднасць, што зашпілька зламаецца. Такім чынам, набыццё несертыфікаванай «ювеліркі», напрыклад, у маленькіх крамах на прыморскіх курортах, заўсёды ўтрымлівае пэўную рызыку.

Як пачаць разбірацца ў ювелірных упрыгажэннях? Як навучыцца разумець, што насамрэч прыгожа, а што вульгарна? Толькі з дапамогай практыкі, кажуць ювеліры. Гэта ўменне выхоўваецца таксама, як уменне разбірацца ў добрых вінах або, напрыклад, у элітных сырах. Тое, што сёння жанчыны нярэдка аддаюць перавагу дэмакратычнай біжутэрыі, а не ўпрыгажэнням з каштоўных металаў, спецыялісты ацэньваюць са знакам «плюс». Прынцып «дорага-багата» сыходзіць у мінулае, і гэта добра. Па-першае, класная аўтарская біжутэрыя фактычна можа каштаваць даражэй, чым нізкапробнае залатое ўпрыгажэнне з фіянітамі замест каштоўных камянёў. А па-другое, нават якасныя залатыя вырабы сёння не з'яўляюцца інвестыцыяй — калі, вядома, гэта не фамільныя каштоўнасці або не эксклюзіўныя ювелірныя шэдэўры ад вядомых дызайнераў. Так што выбіраем тое, што нам па кішэні і па гусце — і адчуваем сябе каралевамі!

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

Ініцыятыва

Фермер на няўдобіцы вырошчвае экзатычныя ягады

# ГАДЖЫКА ПА-ГРОДЗЕНСКУ

**Такі праект гараджанін Яўген ДАРАГУШ «замуціў» у рамках аграэкатурызму. Менавіта «ягадная» адметнасць, на яго думку, стане прывабнай для аматараў усяго незвычайнага. А прымаць турыстаў гаспадар плануе ў Доміку рыбака, які мае намер пабудаваць каля свайго вадаёма.**



Вось тут, мяркуе Яўген Дарагуш, і будуць частаваць гасцей гарбатай з экзатычнымі ягадамі. А хто пажадае, зможа набыць іх у сушаным, свежым ці замарожаным выглядзе. У залежнасці ад сезона. Таксама будуць прапаноўваць і ўласную прадукцыю, напрыклад соус з памідораў, цыбулі і часнаку з дабаўленнем ягад годжы. Менавіты яны надаюць прыправе незвычайны смак. Ужо і назву яму далі — гаджыка. Пры гэтым соус гатуецца без алею і воцату, што значна павышае яго натуральны смак. Зараз поўным ходам ідзе нарыхтоўка такіх прыпраў.

Паралельна вядзецца і збор саміх ягад. Іх збіраюць уручную. Сёлета атрымалі даволі нядрэнны ўраджай, хоць сам гаспадар спадзяваўся на лепшы вынік. Не ўсе кусты пладаносяць аднолькава. Ёсць і сапраўдныя рэкардсмены па ўраджайнасці, а ёсць і такія, з якіх нават кілаграм наўрад ці збярэш. Што канкрэтна паўплывала на такі разнабой, фермер не бярэцца сказаць, бо справа гэта новая, плантацыя закладзена толькі два гады таму.

Але і з першага позірку відавочна, што зямля тут не самая ўрадлівая. Яна хоць і перададзена для фермерскай справы, але, згодна з генпланам, знаходзіцца ў рэкрэацыйнай зоне. Карацей, звычайная няўдобіца. А па сутнасці, тут быў сапраўдны сметнік.

— Па факце гэтыя землі як ворыва ніколі не выкарыстоўваліся, гэта была лугавіна, прытым адны ўзгоркі, і мне, як фермеру, прыйшлося прыводзіць іх у парадак. Трэба было добра павучыцца, кансультавацца з аграномамі, як палепшыць пладароднасць зямель, — расказвае суразмоўнік.

Наогул, каб што-небудзь пасадзіць, тэрыторыю прыйшлося раўняць. Угнойвалі глеем пасля ачысткі вадаёма. Як прыхільнік арганічнага земляробства фермер Дарагуш карыстаецца не пестыцыдамі, а «зялёнымі» ўгнаеннямі — сідэратамі. Напрыклад, зараз на яго ўчастку расце грэчка, якая будзе заарана разам з насеннем. Такім чынам, яна стане арганічнай і насыціць глебу азотам. Яшчэ грэчка добра змагаецца з пырнікам. Гэты ўчастак таксама будзе засаджаны ягадамі годжы. Цяпер у фермера пад іх заняты адзін гектар плошчы. Саджанцы набываў у ЕС, іх спецыяльна адаптавалі да нашага клімату. У Еўропе таксама хочуць займацца іх вырошчваннем, а не прывозіць з Кітая, расказаў Яўген. Там нават распрацавана спецыяльная праграма.

— Мае польскія калегі параілі займацца ягадамі годжы. Мяне гэта зацікавіла, бо яны непатрабавальныя. Але, як паказвае практыка, там дзе ўрадлівы пласт, яны лепш растуць. Гэта відаць і на маім участку. Я наогул не ўяўляў, як яны будуць расці, бо ніхто ў наваколлі гэтым не займаўся. Да таго ж ні ў якіх рэестрах ягады годжы не значыліся. Толькі з мінулага года трапілі ў гэтыя рэестры.

Яўген Дарагуш падводзіць да куста, які найбольш ураджайны. І сапраўды, чырвоныя, прадаўгаватыя плады цяжкімі гронкамі звісаюць з развесістай расліны. Нечым нагадваюць па форме глог, па смаку больш сакавітыя і крыху горкаватыя. Аб карысных якасцях ягад кожны мае магчымасць даведацца з адкрытых крыніц, перш за ўсё ў інтэрнэце. Адтуль чэрпаў інфармацыю і сам Яўген, дарэчы, праграміст па прафесіі. Ён найперш звяртае ўвагу на безліч патрэбных мікраэлементаў, якія ўтрымліваюцца ў пладах.

Самы распаўсюджаны від захавання — гэта сушка. У сям'і фермера менавіта ёй аддаецца перавага. Такія ягады можна дабаўляць у гарбату альбо кампот. І ўвогуле ва ўсе стравы. Ёсць спроба распрацаваць і рэцэптуру гарбаты з лістоў ягад годжы. Кажуць, што на Тыбеце, адкуль, уласна кажучы, і пайшла гэта традыцыя, гатуюць менавіта ліставы настой. Там кусты разрастаюцца вялікімі кронамі.

А вось у Беларусі гэта новы від. На Гродзеншчыне пробную плантацыю некалькі гадоў таму высадзілі ў сельскагаспадарчым філіяле ў Гродзенскім раёне. Другая — у фермера. Праўда, многія спрабуюць у сябе на дачы па некалькі кусцікаў пасадзіць. А вось прамысловымі маштабамі пакуль ніхто не цікавіўся. Хоць ёсць варыянты, куды прадаць.

— Палякі могуць узяць, але там трэба не менш як тону. Налета, мяркую, можна будзе сабраць і на экспарт, — расказвае Яўген. — Цяпер таксама рэалізую, праўда, людзі купляюць невялікімі партыямі — па 100—200 грамаў. Сырая ягада па 15 рублёў за кілаграм. Такімі ж аб'ёмамі набываюць і сушаны прадукт.

І гэта добрая альтэрнатыва кітайскім ягадам, лічыць фермер. За якасць прывазной складана несці адказнасць. Фермер прайшоў курсы па лініі зялёнай гаспадаркі і цяпер карыстаецца толькі арганічнымі метадамі.

— Многія фермеры вырошваюць нешта ўнікальнае ў невялікіх маштабах. Нехта займаецца грыбамі шыітакі, я вось ягадамі годжы. Зараз запыт на нейкія новыя віды, якія зацікавяць гасцей, бо мая задача — турызм, а ягады — складнік у развіцці гэтай справы.

Прывабным турыстычным аб'ектам можа стаць і старажытны млын, які фермер выкупіў і будзе яго аднаўляць у адпаведнасці з былымі функцыямі. Цікавая і сама мясціна, што знаходзіцца на польска-літоўскім памежжы. Але больш за ўсё фермера радуе тое, што сёлета ён атрымаў ад улад дазвол на ўзвядзенне невялікага Доміка рыбака каля вадаёма. Дагэтуль ніякія пабудовы яму нельга было ўзводзіць. І хоць Яўгену прыйшлося прайсці нямала бюракратычных перашкод, ён не шкадуе, што заняўся гэтай справай. Наадварот, пастаянна шукае магчымасць развіваць гэты кірунак. Неадназова прымаў удзел у замежных семінарах як удзельнік праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва. Вось і нядаўна ўдзельнічаў у конкурсе «Экалагічна дружалюбны фермер Балтыйскага рэгіёна — 2020».

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

Свята з каларытам

# КРЫЧАЎСКІ КОНІК ПА ГУКУ ЧУЕЦЦА ЗДАЛЁК



**«Ён і свішча, і пяе, усім радасці нясе». Гэтымі словамі распачаў V міжрэгіянальны фестываль-конкурс народнай творчасці «Крычаўскі конік» яго ідэйны натхняльнік — народны майстар Беларусі Вячаслаў ЯКАВЕНКА. Крычаў чарговы раз прымаў у сябе гасцей: аматараў і майстроў самабытнай падняпроўскай глінянай цацкі з розных куткоў Беларусі і расійскага Рослаўля.**



— Толькі ў Крычаве майстры ляпілі такую форму коніка, якую вы бачыце: без ножак і падобную на шахматную фігурку. У гэтым яго адметнасць і вядомасць далёка за межамі Беларусі, — падкрэсліў Вячаслаў Якавенка.

Сёлета, дарэчы, удзельнікаў не абмяжоўвалі ў тэматыцы — ляпілі, каму што хацелася. Тут былі і пастаянныя ўдзельнікі, як расійскі мастак Міхаіл СОТНІКАЎ. Ён прывёз і свае работы, і ўдзельнічаў у конкурсе:

— У Наваполацку быў на пленэры, дзе дзеці пісалі масляной гуашшу. Мне спадабалася, як гэта выглядала, як з дапамогай гуашы можна перадаць фактуру таго, што малюеш, — і я стварыў цэлую серыю.





Яго дачка і ўнук таксама ўдзельнічалі — кажуць, што гэта ўжо стала добрай традыцыяй сяброўства.

Юных талентаў на конкурсе было больш за ўсіх. Вікторыя Навіцкая ляпіла сабаку, Вераніка Кухарава стварыла насценнае пано з ружай. Дзяўчаты вучацца ў сёмым класе і займаюцца ў Любові ЯШЧАНКІ, члена Беларускага саюза майстроў народнай творчасці, якая ўжо дваццаць гадоў як жыве гліняным рамяством і перадае яго сакрэты ўсім ахвотным:

— Дзеці, якія да мяне прыходзяць, па-сапраўднаму захапляюцца глінай. А бацькі бачаць, што пасля заняткаў у малых маторыка паляпшаецца, увага засяроджваецца, яны пачынаюць лепш вучыцца, і тады расказваюць іншым бацькам, а тыя прыводзяць ужо сваіх малых. Таму мне часам няма куды пасадзіць сваіх вучняў, але нікому не адмаўляю. Калі вочы дзяцей гараць, як ім адмовіш?!

На конкурсе сёлета былі і навічкі.

— Дачка спачатку сказала: «Мама, не пераводзь гліну», але пасля ўсё ж здалася, правяла для мяне майстар-клас і нават дала свае прафесійныя інструменты і чарцёж намалявала, — смяецца Ніна СТРАЛЬЦОВА з Магілёва, якая робіць сферу з гіпсу, куды пасля можна апусціць нарыхтоўку, каб стварыць форму: званочак, свістульку, што заўгодна. — Я адразу на конкурс і запісалася.

На свята ў Крычаў з'ехаліся і работнікі культуры з навакольных раёнаў са сваімі работамі. Сёлета найбольшы акцэнт яны зрабілі не на ўпрыгажэнні сваіх падворкаў, хоць і яно было на высокім узроўні, а на пачастунках: аладкі, сала, каўбаскі, марынаваныя грыбочкі, сырнікі... І да ўсяго гэтага яшчэ і адпаведныя напоі...

Умельцы, якія прадстаўлялі на фестывалі Касцюшковіцкі сельсавет, смажылі дранікі непадалёк. Патэльня на некалькіх звязаных дротам паленцах — вось вам і печ. Дэкаратыўная печ, дарэчы, тут таксама была, а каля яе завіхалася Галіна СЦЯПАНАВА, мясцовая захавальніца таямніцы выпечкі хатняга хлеба:

— Я дагэтуль пяку хлеб у печы на спецыяльнай хлебнай лапаце. Паказваю іншым, як саджаць яго ў печ, як вымаць. Расказваю, што кляновыя лісты трэба пакласці, крыху падсыпаць мучыцы, і будзе ён смачнейшы, чым з крамы.

Гасцінны стол з прысмакамі ды яркімі закаткамі з гародніны арганізавалі і ў Бацвінаўскім сельсавеце. На іх падворку пастараліся аднавіць атмасферу вясковай хаты з печчу, вышыванкамі, ручнікамі і покуццю.

А Вольга ДАМАРАЦКАЯ з аграгарадка Красная Буда раскрыла сакрэт, як згатаваць халадзец у выглядзе парасяці:

— Трэба яго заліць застываць у пластыкавую бутэльку, а пасля разрэзаць яе, уставіць «вушкі» і «хвосцік».

Карацей, хапіла ўсім — і пагледзець, і пакаштаваць, і набыць, што па душы прыйшлося.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

# «УСМІХАЮЦЦА КВЕТКІ ЛАБЕЛІІ...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сёння чытачы «Звязды» маюць магчымасць упершыню пабачыць факсіміле згаданых рукапісаў.

Давайце ўважліва пазнаёмімся з гэтымі рарытэтамі, параўнаем іх з тым варыянтам, у якім яны пададзены ў другім томе збору твораў Уладзіміра Караткевіча ў 25 тамах.

Усе чатыры вершы пабачылі свет у зборніку «Мая Іліяда», які выйшаў у 1969 годзе. Напісаныя яны ў складаны для паэта час. У 1958-м ён перабраўся ў Маскву, вучыўся на Вышэйшых літаратурных курсах, пасля — на сцэнарных курсах, у Інстытуце кінематаграфіі. У гэты час ён перажыў моцнае, але нешчаслівае каханне да сваёй выкладчыцы з літаратурных курсаў, вядомай мастацтвазнаўцы Ніны Молевай. Караткевіч апісаў гэтыя падзеі ў рамане «Нельга забыць», набор якога быў рассыпаны ў 1963-м. Зрэшты, пра няшчаснае каханне — усе чатыры вершы, нават самы аптымістычны — «Песня закаханага».

Да сустрэчы з той, што стане жонкай вялікага рамантыка, пройдзе яшчэ некалькі гадоў — з гісторыкам Валянцінай Нікіцінай Уладзімір Караткевіч пазнаёміцца ў 1967-м.

Давайце паглядзім, якія праўкі былі ўнесены ў вершы, падораныя Ларысе Глебавай.

## ПЕСНЯ ЗАКАХАНАГА

У «Песні закаханага» змянілася назва. Цяпер гэты твор вядомы як «Легкаважная песня, якую я спяваў, ідучы да каханай цераз хрыбет Мангугай». У новай назве — водгулле вандровак паэта па Камчатцы, менавіта ў Прымор'і знаходзіцца Мангугай. Радок «І баркасы спяць на вадзе» ператварыўся ў «І кунгасы спяць на вадзе». Кунгас — невялікі карабель з ветразем, такія часта сустракаюцца на Далёкім Усходзе. Відавочна, што Караткевіч надаваў вершу далёкаўсходні каларыт. Дык і напісаў жа верш ва Уладзівастоку падчас свайго незвычайнага падарожжа. Адбылося гэта, згодна з успамінам Рыгора Барадуліна, так: «Сядзелі мы ўтрох у мяне на кватэры па вуліцы Бялінскага. Калі бутэлькі на стале можна было падстаўляць ветру, каб свістаў, сумна пачалі разважаць, што хочацца паездзіць, свету пабачыць. Мне цюкнула ў галаву пазваніць генералу Аляксееву, які ўзначальваў ваенна-шэфскую камісію пры Саюзе пісьменнікаў... І пазваніў я генералу Аляксееву, каб паслаў ён нас на стажыроўку ў якую-небудзь вайсковую газету. Нас — гэта Уладзіміра Караткевіча, Генадзя Кляўко і мяне».

Ну вось вясёлыя пісьменнікі і наклікалі на свае мудрыя галовы прыгодаў: восенню 1964-га ўсім тром даслалі павесткі ў ваенкамат, а 1 жніўня 1965-га яны ўжо адзначалі прылёт ва Уладзівасток у вакзальнай рэстарацыі, а пасля пачалася стажыроўка ў газеце Ціхаакеанскага флоту «Баявая вахта». Караткевіч знаходзіў магчымасць набрацца ўражанняў — блукаў па запаведніках, відаць, і плаваў на згаданых кунгасах. А яго тагачасны настрой адлюстроўвае запіс у дзённіку за 29 жніўня 1965 года: «Пане ты мой Божа! Няўжо дзеля таго, каб рабіць тую справу, дзеля якой ты створаны і якую можаш скончыць толькі ты, — трэба ўцякаць у скіт ад ілжэпрыяцеляў, ілжэжанчын, ілжэлюдзей і ілжэдумак? І, калі трэба, — дзе ён, гэты скіт? А калі проста ўцячы ў нейкую леснічоўку — як сумясціць з гэтым жаданне віруючай дзейнасці сярод сабе падобных і яшчэ жаданне адшукаць і знайсці тую адзіную жанчыну...» 1 верасня аўтар гэтага запісу пачынае пісаць верш «Песня закаханага».

## ЛЕГКАВАЖНАЯ ПЕСЕНЬКА, ЯКУЮ Я СПЯВАЎ, ІДУЧЫ ДА КАХАНАЙ ЦЕРАЗ ХРЫБЕТ МАНГУГАЙ

Паветра п'янае, бы Цынандалі.
Крочу я проста ў дзень,
І рытм па скалах чаканяць сандалі,
І кунгасы спяць на вадзе.
Успудзіў кайру. Яна наракае,
Што іду без дарог,
І языкамі капуста марская
Ліжа сцежку ля самых ног.
На вуснах свіст, як матыль, трапеча.
Доўгі шлях. За гарой гара.
І ў моры рыфаў магутныя свечы
Ў сонцы раннім гараць.

1,4(7?) верасня 65 г. Уладзівасток


Песня закаханага


Раманс шлагбаума

## РАМАНС ШЛАГБАУМА

Верш пазначаны датай «15.VI.63». У творы адчуваюцца тыя ж самыя рытмы, што і ў вершах з рамана «Нельга забыць». Зноў — няшчаснае каханне, надрыў, герой, які атаясамлівае сябе са шлагбаумам і развітваецца з вераломнай каханай: «Ён упаў на дарогу, ён тросся ад болю. «Ну нашто так? Ты ж бачыш, — Спакой у вачах». І шлагбаум устаў. Даволі... Даволі...»

У гэтым вершы ніякіх правак не ўзнікла.

Параўноўвайце рукапісы з апошнімі варыянтамі вершаў, углядайцеся ў почырк нашага ўлюбёнага пісьменніка і проста атрымлівайце асалоду ад цудоўнай паэзіі, прасякнутай палкім пачуццём.

Ён упаў на дарогу,
Ён тросся ад болю.
«Ну нашто так?
Ты ж бачыш, —
Спакой у вачах».
І шлагбаум устаў.
Даволі...
Даволі...
Гэта будзе ніколі,
Ніколі,
Ніколі —
Колаў стук
І прысады...
Гасцінец
І шлях.
Не гляджу наўздагон.
Хай знікае
Ў лагчыне...
Не гляджу!
Як цікава:
Трава...
Раса...
Хай шлагбаум глядзіць
Узнятай вяршыняй,
Як знікаеш ты...
Кропкай...
Пад ценем...
Прысад.

15.VI.63

Тэксты вершаў паводле т. 2 збору твораў Уладзіміра Караткевіча ў 25 тамах.

## РАМАНС МАРЫЛІ

У 1963 годзе Караткевіч піша тужлівы ліст Ніне Молевай — апошні вядомы яго ліст да названай асобы («До сих пор не могу придти в себя, и мне делается не по себе от воспоминаний о нашей последней встрече»). Тады ж нараджаецца «Раманс Марылі», гераіня якога — Марыля Верашчака, каханая Адама Міцкевіча, якая не змагла стаць ягонай жонкай. Зразумела, чаму паэт звярнуўся да гэтага сюжэта, дзякуючы якому выказаў уласныя перажыванні. Дарэчы, і вобраз хлопчыка, які сціскае горла лебедзю, мог узнікнуць невыпадкова: у 1963-м пісьменнік атрымаў кватэру на мінскай вуліцы Карла Маркса, непадалёк ад сквера, дзе стаіць скульптура «Хлопчык з лебедзем». Вядома, што Караткевіч любіў там бываць.

Як змяняўся верш? Кветкі алыя зрабіліся сінія, ружа белая — алая. Слова «быццам» заменена на «нібы», «Пад вясёлак халодны звон» — на «Праз вясёлак халодны звон». Але ў выніку правак з'явілася таўталогія — замест «бо ў шуме і грае», як было ў арыгінале, з'явілася «бо ў звоне і грае», то-бок паўтараецца слова «звон», якое ўжывалася трыма радкамі вышэй. А самае галоўнае — знікла страфа, якая, наколькі вядома, больш не сустракаецца ні ў адным вядомым варыянце верша. У гэтых строфах гучыць прыхаваны дакор да гераіні, якая забылася на закаханага ў яе паэта:

*«Усміхаюцца кветкі лабеліі,*
*Архідэя падступна маўчыць,*
*Пад руку з камеліяй белаю*
*Ходзяць «кручаныя панічы».*

Сонца паліць над шатамі парку,
Ў вочы людзям дзідамі б'е,
Людзі — кветкі нясуць на карках
Пчол назойлівых — думы свае.
Кветкі сінія, вогненна-чорныя,
Хмель хістаецца ўгору і ўніз,
Ружы алай нешта гаворыць
Самаўпэўнена — тонкі нарцыс.
Сярод гэтага кветніка п'янага
(Мо было ўжо такое калісь?)
Ты праходзіш адна ля фантана,
Найпрацейшая кветка зямлі.
Нібы ціхая сумная музыка,
Ты праходзіш з пакорай сваёй,
Абдуванчык на ярасным лузе,
Кветка з жоўтаю галавой.
І з фантана, раскрылўшы крылы,
Праз вясёлак халодны звон
Ўсімі рэшткамі бронзавай сілы
Лебедзь рвецца табе наўздагон.
Марна рвецца, бо ў звоне і грае,
У мільёнах вясёлкавых слёз
Хлопчык лебедзю шыю сціскае,
Як адвечны няўмольны лёс.
І гляджу я змрочна на тое,
Як, абернуты ў шумнай вадзе,
Цень Міцкевіча нада мною
Лебядзіную песню вядзе.

15.VI.63


Раманс Марылі

## РАМАНС ВІНАГРАДНАЙ ЛАЗЫ

Гэты верш Уладзімір Караткевіч напісаў у Рагачове 12 мая 1962 года, знаходзячыся ў самым эпіцэнтры сваіх куртуазных перажыванняў. У Рагачове Караткевіч часта гасцяваў у дзедавай хаце, у свайго дзядзькі Ігара, настаўніка. Там плённа пісалася «ў старасвецкай хаце, у дзедаўскім родным гняздзе». У рамане «Нельга забыць» яскрава апісваецца, як герой, у стрэсе ад выбрыкаў жорсткай каханай, прыязджае да дзядзькі і ратуецца старасвецкай атмасферай і апантанай творчасцю. «Раманс вінаграднай лазы» вельмі рытмічны, нагадвае вершы Гарсіі Лоркі, у ім нібыта чуюцца рытмы гітары, якая згадваецца ў творы. Змен адбылося няшмат, хіба што скарочаны паўтор слова «Уюцца», «У завулках так плача гітара» стала адным радком, «Што з таго, што калісьці» — наадварот, двума.

Па туманах касых
Вінаградныя вусікі
Ўюцца
І імкнуцца спаймаць
Малады
І гарэзлівы месяц.
За глыбокія вочы твае,
Што ў тумане,
Блакітным тумане
Смяюцца,
Хай мяне на праменнях
Туманных,
Абвітых,
Спайманых
Праменных
Павесяць...
Ах, як вішні цвілі!
Як здрадлівая
Белая мара!
Зацягнулі,
Зававілі
Песняй
Птушынай сваёй.
А цяпер у завулках,
У завулках так плача гітара
Ненадзейнай,
Пакінутай,
Цалкам адрынутай,
Цалкам жаночай
Тугою.
О, як хочацца жыць!
Што з таго,
Што вясенняй парой
З вішань квецень
Зляцела
Завяей,
Пяшчотнай І сіняй.
Што з таго,
Што калісьці
Пампуць
Пад асенняй
Халоднай касой
Залатыя вяргіні...
Вяргіні...
Вяргіні...
Дваццаць год яшчэ можна кахаць!
Дыхаць квеценню,
Летам і маем.
Дваццаць год
Вінаградныя вусікі
Будуць віцца
Па месячных струнах...
Ах, няхай яны ўшчэнт заплятуць,
Ах, няхай яны мякка спаймаюць
Гэты месяц гарэзлівы,
Месяц вясёлы
І юны.

12.V.62 Рагачоў


Раманс вінаградный лазы

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

## Извещение о проведении 10 ноября 2020 года торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего СЗАО «Белфарм»

| | |
|---|---|
| **Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)** | Здание специализированное розничной торговли по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Советская, д. 15, общая площадь – 858,7 кв. м, инвентарный номер 300/С-2785, составные части и принадлежности: пристройка, тамбур, подвал, склад, два сарая, беседка, забор, ворота с калиткой, покрытие |
| **Сведения о земельном участке** | Кадастровый номер 340100000001001412, площадь – 0,0845 га |
| **Обременения** | Ипотека |
| **Продавец имущества** | СЗАО «Белфарм», 220005, г. Минск, пр. Независимости, 58, пом. 4, антресоль 1 этажа, тел. (029) 181-71-17 |
| **Организатор торгов** | Государственное предприятие «МГЦН», 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10, тел. (017) 365-48-36 |
| **Начальная цена, с учетом НДС** | 1 674 465,00 долларов США |
| **Размер задатка** | 200 000,00 бел. руб. |
| **Условия торгов** | Победитель торгов (покупатель) в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в белорусских рублях в размере, эквивалентном 1 проценту от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь на день проведения торгов |

Торги проводятся в соответствии со статьями 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения торгов по продаже имущества, принадлежащего СЗАО «Белфарм», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах от 10.11.2020.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС.

В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Стоимость продаваемого имущества определяется в размере, эквивалентном наивысшей цене в долларах США, указанной в протоколе о результатах торгов, и подлежит оплате в белорусских рублях по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь на день перечисления денежных средств на счет продавца в соответствии с условиями договора купли-продажи предмета торгов с учетом внесенной суммы задатка.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **10 ноября 2020 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 06.10.2020 по 06.11.2020 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**

**(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); по осмотру имущества (029) 181-71-17 (СЗАО «Белфарм»).**

**Дополнительная информация размещена на сайте организатора торгов – www.mgcn.by.**

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09, BELTORGI.BY

Продавец: **ЗАО «Райагропромэнерго»** (УНП 700003443) в лице ликвидатора Осипенко А. Г., тел. +375 29 155-37-27.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **30 октября 2020 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке BELTORGI.BY.

**Предмет торгов –**

**ЗДАНИЕ МНОГОФУНКЦИОНАЛЬНОЕ с инв. № 710/С-74354 г. Бобруйск, ул. Гоголя, д. 188, ЗДАНИЕ КОТЕЛЬНОЙ с инв. № 710/С-2705 г. Бобруйск, ул. Гоголя, д. 188/1, ЗДАНИЕ РАСПРЕДЕЛИТЕЛЬНОГО УСТРОЙСТВА с инв. № 710/С-74953 г. Бобруйск, ул. Гоголя, д. 188/2.**

Начальная цена предмета торгов – 140 000,00 бел. руб. с НДС.
Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 %
от начальной цены предмета торгов.
Телефон для ознакомления и осмотра +37529 155-37-27.

**Для участия в торгах необходимо в срок с 07.10.2020 г. 09.00 по 29.10.2020 г. 17.00:** 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее десяти рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах опубликовано в газете «Звязда» от 16.09.2020 г.

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## по объекту «Многоквартирный жилой дом с помещениями общественного назначения и подземным гаражом-стоянкой по ул. Гастелло»

### Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг»

информирует о привлечении денежных средств граждан, включая индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, для долевого строительства нежилых помещений в жилом доме по ул. Гастелло в городе Минске на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и ограничения прибыли застройщика)

**Информация о застройщике:**

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг», зарегистрировано решением Минского областного исполнительного комитета от 30 апреля 2003 г. № 318 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690237128.

Место нахождения: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, телефон/факс +375 (17) 392-20-45(46), +375 (29) 333-55-66.

Режим работы: понедельник–пятница: с 09.00 до 17.00, выходные дни – суббота, воскресенье, обед: 13.00–14.00;

работа не производится в государственные праздники и праздничные дни.

**Сведения о жилых домах и иных объектах недвижимости, в строительстве которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих опубликованию проектной декларации**

